# «Нам трэба мірнае, спакойнае жыццё напоўніць высокай якасцю»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Перад урадам Прэзідэнт ставіць усяго адну галоўную задачу — клапаціцца пра эканоміку, усё астатняе бярэ на сябе кіраўнік дзяржавы. «Таму нам трэба прыкласці максімум намаганняў, каб мы маглі не проста вырабіць тавар (а эканоміка — гэта вырабіць і прадаць), але зрабіць гэта якасна, каб наш тавар купляўся — яшчэ лепш, чым сёння», — удакладніў ён.

Прэзідэнт выказаў удзячнасць мітрапаліту, усім свяшчэннаслужыцелям за дзеянні, якія яны здзяйсняюць у імя беларускага народа, нашай дзяржавы, царквы, у імя жыцця Беларусі. «Яны робяць вельмі вялікую справу, — заўважыў кіраўнік дзяржавы, кажучы аб прадстаўніках духавенства. — Вядома, і ў гэты год ім прыйдзецца прыкласці нямала намаганняў для таго, каб Год якасці быў па-сапраўднаму якасным у кожным чалавеку. За тое, што нашы свяшчэннаслужыцелі робяць, яны заслугоўваюць павагі і ўдзячнасці».


Фота БелТА.

### «НАМ ТРЭБА ЗРАБІЦЬ УСЁ, КАБ МЫ ГОДНА ПРАЙШЛІ, ПРАЖЫЛІ ГЭТЫ ГОД»

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ў гэтыя самыя складаныя ў яго жыцці часы, калі Прэзідэнт запатрабаваны ўсюды, ім сказана вельмі многае. Па яго словах, мы стаім на парозе змены пакаленняў. «Калі ўсё, што зроблена — дрэнна або добра (магчыма, не нам судзіць), нам не сёння-заўтра прыйдзецца перадаць падрастаючаму пакаленню — нашым з вамі дзецям, — падкрэсліў беларускі лідар. — Такое жыццё».

Прэзідэнт папрасіў быць уважлівымі ў гэты няпросты год. «На нас будуць трэніравацца, і нам трэба выстаяць, — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка. — Будуць трэніравацца да будучых прэзідэнцкіх выбараў. Нам трэба звярнуць асаблівую ўвагу на моладзь, якая не бачыла складаных часоў: ні ў савецкі перыяд, ні пасля распаду Савецкага Саюза. Яны не пражылі тое, што пражыло сярэдняе і старэйшае пакаленне. Ім трэба аб гэтым расказаць, ім трэба паказаць, каб яны цанілі тое, што нажыта нашай працай. Нам трэба зрабіць усё, каб мы годна прайшлі, пражылі гэты год».

Падышоўшы да галоўнай падзеі — электаральнай кампаніі, — кіраўнік дзяржавы адзначыў, што варта годна паказаць сябе. Па яго словах, беларускі народ, які нацярпеўся, напакутаваўся ў сваёй гісторыі, мае права жыць па ўласных законах, а таму павінен прадэманстраваць, што мы гаспадары на гэтай зямлі.

### «СТРАЦІМ ВЁСКУ — СТРАЦІМ ДЗЯРЖАВУ»

Будучы ў сельскім храме, Аляксандр Лукашэнка закрануў тэму вёскі. «Вы бачыце, што ў гэтыя няпростыя часы мы робім нямала для таго, каб захаваць вёску, — звярнуў увагу ён. — Я не буду называць дзяржавы постсавецкага перыяду (я іх ведаю добра, за гэтыя гады ўбачыў, пабываў), якія разбурылі вёску. У гэтых краін будучыні няма. Страцім вёску — страцім дзяржаву. Яе проста не будзе. Таму я вам абяцаю, як чалавек, які вырас у вёсцы, ведае жыццё сельскага чалавека, складанасці і цяжкасці, я зраблю ўсё, каб захаваць нашу вёску, каб вёска (яна сёння — карміліца нашых людзей, фундамент нашай дзяржавы) была моцнай, магутнай і квітнеючай. Гэта не значыць, што мы забудзем гарады (гэта прамысловасць, без яе не можа развівацца тая ж вёска), мы будзем рабіць усё, каб развіваць нашу эканоміку. У нас ёсць для гэтага ўсё, нягледзячы на складаныя часы».

Віншуючы прыхаджан, а таксама ўсіх беларусаў са светлым святам Раства Хрыстовага, Прэзідэнт у першую чаргу пажадаў ім здароўя. «Здароўя, здароўя і яшчэ раз здароўя! Усё астатняе, як я кажу, мы купім, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — Не купім — іншым спосабам здабудзем. Мазгоў у нас хапае, людзей таксама хапае — добрых і працалюбівых». Таксама кіраўнік дзяржавы пажадаў здароўя дзецям, каб яны заўсёды былі ў радасць дарослым.

Аляксандр Лукашэнка перадаў у падарунак храму Святога прарока Іаана Прадцечы ікону Божай Маці «Дзяржаўная». Ікона выраблена майстрамі іканапіснай майстэрні Свята-Елісавецінскага жаночага манастыра ў традыцыйным для беларускай школы іканапісу стылі, ва ўнікальнай тэхніцы васковай тэмперы.

У царкоўных летапісах захаваліся шматлікія сведчанні таго, як добрая сіла іконы Божай Маці «Дзяржаўная» змяняе жыцці людзей. Перш за ўсё да яе звяртаюцца тыя, хто пакутуе ад хвароб. Святыня дазваляе хутчэй пераадолець хваробу і справіцца з яе наступствамі. Акрамя таго, да аблічча Прачыстай Дзевы звяртаюцца хрысціяне, якія мараць знайсці вернага спадарожніка жыцця, стварыць моцную і шчаслівую сям'ю, абзавесціся дзецьмі. Прыхаджане просяць ад Дзяржаўнай іконы Божай Маці міру і спынення войн.

### «КАБ УСЁ БЫЛО ЯКАСНА І Ў ДУХОЎНАЙ СФЕРЫ»

У сваю чаргу, Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веніямін, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі, падзякаваў Прэзідэнту за добрыя пажаданні. «Мы маем магчымасць цяпер толькі ў некаторай ступені спазнаць аб тых думах і перажываннях, якімі напоўнена душа Прэзідэнта і ў свята, і тым больш у будні, — адзначыў Уладыка. — Гэта перажыванні аб цяперашнім і будучым нашай краіны, аб жыцці грамадства і кожнага чалавека паасобку».

Мітрапаліт нагадаў аб значэнні Раства Хрыстова, якое з'яўляецца найвялікшай падзеяй у жыцці ўсяго чалавецтва. «Гасподзь дае людзям, усяму чалавецтву, свае вялікія і багатыя міласці, — падкрэсліў Уладыка. — Ен прыйшоў для выратавання роду чалавечага. Нам у Год якасці застаецца толькі звяртацца да гэтых дароў божых, прыкладаць, вядома, сваю працу, клапаціцца, каб усё было якасна не толькі на ўзроўні прамысловасці, але і ў духоўнай сферы».

Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі падарыў кіраўніку дзяржавы ікону Святыцеля Мікалая Цудатворца. Ікона таксама створана ў іканапісных майстэрнях Свята-Елісавецінскага жаночага манастыра. Святыцель Мікалай Цудатворац з'яўляецца адным з найбольш шанавальных святых. Прычым ён шануецца ўсімі хрысціянскімі канфесіямі, аб чым сведчыць вялікая колькасць храмаў, асвечаных у гонар Мікалая Цудатворца. Святыцеля Мікалая яшчэ пры жыцці празвалі Цудатворцам. Лічыцца, што і пасля смерці ён працягвае хадзіць па свеце і рабіць цуды.

**Вераніка КАНЮТА.**

# «Мы вас будзем чакаць»

**Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з беларускамі, якія рыхтуюцца да палёту ў космас**

У Палац Незалежнасці прыехалі асноўная ўдзельніца маючага адбыцца касмічнага палёту Марына Васілеўская і дублёр Анастасія Лянкова. Дзяўчаты праходзяць навучанне ў Навукова-даследчым выпрабавальным цэнтры падрыхтоўкі касманаўтаў імя Ю. А. Гагарына. Чакаецца, што касмічны палёт адбудзецца ўжо сёлета.

Аляксандр Лукашэнка павіншаваў удзельніц касмічнай праграмы з Новым годам і Калядамі, падарыў ім кветкі і наручныя гадзіннікі. «Раптам час перабблытаеце... Але я ўстанавіў дакладны беларускі час», — з гумарам адзначыў кіраўнік дзяржавы.

«Ну дык што, паляцім? Ці перадумалі?» — пацікавіўся Прэзідэнт.

Дзяўчаты ўпэўнена адказалі, што планы застаюцца ранейшымі і палёт у космас абавязкова адбудзецца.

«Але мы вас будзем чакаць тут», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён удакладніў, ці рыхтуюцца асноўны ўдзельнік і дублёр па адной і той жа праграме. І гэта сапраўды так. «Самае галоўнае, каб ніякай рэўнасці не было, — даў наказ кіраўнік дзяржавы. — Вы не прападзяце ўсё роўна. З мільёнаў дзяўчат выбралі вас».

**Паводле прэс-службы Прэзідэнта.**

### У тэму

**Пасля сустрэ ы з Прэзідэнтам арына Васілеўская і Анастасія Лянкова падзяліліся з журналістамі сваімі ўражаннямі і планамі.**

«Я ў першую чаргу хацела б падзякаваць кіраўніку дзяржавы за такі душэўны прыём — святочны, сардэчны, — адзначыла Марына Васілеўская. — Удзячная за тое, што мы ў гэтым праекце. Настроены рашуча. У нас глабальныя перспектывы для нашай краіны, нашага народа, і мы будзем рабіць усё для таго, каб вырашыць пастаўленыя задачы. Вядома, Прэзідэнт нас падтрымлівае і дапамагае ва ўсім. Гэта вельмі адчувальна і надае вялікую сілу, бо без прамога ўдзелу кіраўніка дзяржавы гэтага праекта не было б».

Дзяўчаты працягваюць падрыхтоўку да палёту ў Зорным гарадку, што ў Падмаскоўі. Іх чакаюць комплексныя трэніроўкі, іспыты, а затым ад'езд на касмадром Байканур, дзе пройдзе канчатковая падрыхтоўка да палёту.

«Ці не страшна?» — пацікавіліся журналісты ў Марыны Васілеўскай.

«Не, не страшна, — адказала яна. — Гонар за нашу краіну. Толькі поўны наперад! Сілы, баявой рашучасці — усяго хапае. Мне вельмі спадабаўся скафандр. І я зразумела, што бязважкасць — гэта мая стыхія. Радзіма сустрэла цёпла. Новы год з роднымі і блізкімі — гэта не замяніць. Мы з радасцю нацешыліся гэтымі хвілінамі і гадзінамі, бо час пралятае вельмі хутка — з касмічнай хуткасцю. Быццам бы мы нядаўна прыехалі ў Зорны гарадок, а ўжо палёт у сакавіку».

Яна расказала, што касманаўтам дазваляецца ўзяць на арбіту толькі адзін кілаграм асабістых рэчаў: «Вядома, вазьму сваю дзіцячую сямейную фатаграфію. Натуральна, беларускі сцяг, алімпійскі сцяг, сцяг Акадэміі навук». НАН Марына Васілеўская выказала асаблівую падзяку за падтрымку і ўдзел у рэалізацыі праекта.

Не меншая падтрымка адчуваецца і з боку ўраджэнца Беларусі касманаўта Алега Навіцкага, які разам з Марынай Васілеўскай рыхтуецца да чарговага палёту ў космас. «У нас вельмі зладжаны экіпаж, — распавяла Марына Васілеўская. — І Алег Навіцкі ва ўсім падтрымлівае, дапамагае. Вельмі чулы, адказны, моцны і разумны чалавек. На трэніроўках — строгі, але справядлівы. І гэта правільна. Субардынацыю я трымаю. Праца вельмі сур'ёзная, бо касманаўтыка памылак не прымае. Спрацаваліся добра. У нас вялікая навуковая праца, якая складаецца з эксперыментаў. Даляцець, вядома, вельмі важна, але таксама важна выканаць будучую працу — нашу навуковую праграму».

У сваю чаргу дублёр Анастасія Лянкова пацвердзіла, што сустрэча ў кіраўніка дзяржавы натхняе і матывуе. Самым складаным і цяжкім у працэсе падрыхтоўкі яна назвала чаканне «дня ікс». «Зараджаны, вядома, у баявым настроі, — распавяла Анастасія Лянкова. — Займаемся. Экіпажныя трэніроўкі ў нас сумесныя, дзе мадэлююцца розныя пазаштатныя сітуацыі, фізічная падрыхтоўка, тэарэтычныя пытанні, таксама падрыхтоўка па мэтавых праграмах, якія плануюцца на палёт, і многае іншае. Усё робім, як запланавана цэнтрам. Вучымся, рыхтуемся».

урналісты таксама пацікавіліся, ці ёсць у касманаўтаў нейкія асаблівыя прыкметы. Такія сапраўды ёсць, пацвердзілі дзяўчаты, але большасць з іх датычыцца знаходжання на Байкануры непасрэдна перад палётам. У касманаўтаў, напрыклад, не прынята даваць аўтографы да палёту.

На слыху

# ТАКОГА ЛЬГОТНАГА КРЭДЫТУ СПАЖЫЎЦЫ ЯШЧЭ НЕ БАЧЫЛІ

## Да 12 тысяч рублёў пад 4 % гадавых



**Літаральна ў апошнія дні мінулага года Савет Міністраў нашай краіны прыняў пастанову № 992 Аб спажывецкім крэдытаванні», каб такім чынам прастымуляваць унутраны попыт у краіне. Банкіры з ініцыятывай урада пагадзіліся. І ўжо ў першы тыдзень новага года Беларусбанк стварыў унікальны крэдыт на спажывецкія патрэбы і назваў яго «На родныя тавары».**

Як адзначыла намеснік старшыні праўлення банка Святлана Кажэкіна, падтрымка важных дзяржаўных ініцыятыў, якія скіраваныя на развіццё эканомікі, — традыцыйны складнік дзейнасці гэтага фінансавага інстытута. А дзякуючы новаму крэдыту адбудзецца стымуляванне попыту на айчынныя тавары, што будзе мець станоўчы ўплыў на развіццё прадпрыемстваў і дапаможа грамадзянам палепшыць свой побыт, павысіць іх якасць жыцця. Тым больш што гэты год абвешчаны Годам якасці, а якасць — сінонім тавараў айчынных брэндаў.

Крэдыт будзе выдавацца на 3 гады пад фіксаваную на ўвесь тэрмін крэдытавання стаўку 4 % гадавых для набыцця тавараў беларускіх вытворцаў.

### ШТО МОЖНА КУПІЦЬ І Ў КАГО?

Падрыхтаваны дакладны пералік тавараў, для набыцця якіх грамадзянам даюцца гэтыя льготныя крэдыты. Па-першае гэта ровары, мапеды і матаровары, матацыклы, матаролеры ад Мінскага матавелазавода. Тэлевізары, якія выраблены на акцыянерным таварыстве «Віцязь» і на ўнітарным прадпрыемстве «Гарызонт».

Матаблокі і міні-трактары ад Мінскага трактарнага завода. За льготны крэдыт можна набыць амаль любую мэблю айчыннага вырабу (спіс досыць буйных фабрык у нас максімальна аб'ёмны). Гэта і «Маладзечнамэбля», ЗАТ «Холдынгавая кампанія «Пінскдрэў», «Гомельская мэблевая фабрыка «Прагрэс», акцыянернае таварыства «Мінскпраектмэбля» і іншыя.

Халадзільнікі, маразільнікі і машыны пральныя ад фірмы «Атлант». Кухонныя машыны «Амкадор-Белвар» і мікрахвалевыя печы ўнітарнага прадпрыемства «Гарызонт». Газавыя або электрычныя пліты, посудамыйныя машыны, якія выпрабляюць на прадпрыемстве «Брэстгазаапарат», а таксама плітка керамічная ад «Бярозабудматэрыялы» і ААТ «Керамін» і санітарна-тэхнічнае абсталяванне ад «Кераміна» і прадпрыемства «Белюкс ЛТД».

### УНІКАЛЬНАСЦЬ БАНКАЎСКАЙ ПРАПАНОВЫ

Напэўна, галоўнымі асаблівасцямі гэтага фінансавага прадукту стане малая працэнтная стаўка, афармленне дагавора без паручыцеляў і страховак, а таксама адсутнасць дадатковых камісій і плацяжоў за карыстанне крэдытам.

Немалаважным будзе той факт, што для некаторых людзей ёсць магчымасць афармлення крэдыту без даведкі аб даходах у памеры, які не перавышае 25 базавых велічынь (1000 рублёў), а для грамадзян, якія дасягнулі агульнаўстаноўленага пенсіённага ўзросту — 20 базавых велічынь (800 рублёў). Маецца зручныя спосабы пагашэння крэдыту (у інфакіёсках банка, праз сістэму «Інтэрнэт-банкінг» і паслугу «М-банкінг», Аўтааплата).

Крэдыт выдаецца ў памеры, які не перавышае 300 базавых велічынь (12 тысяч рублёў), у межах плацежаздольнасці крэдытаатрымальніка, але не менш за 100 рублёў. Агульная сума крэдытаў «На родныя тавары», якія выдадзены адной фізічнай асобе ў перыяд з 01.01.2024 да 31.12.2024 (уключна), не можа перавышаць 300 базавых велічынь, устаноўленых на дату заключэння крэдытнага дагавора.

Крэдыт выдаецца шляхам безнаяўнага пералічэння на рахункі прадаўцоў айчынных тавараў на падставе дакументаў на аплату тавару (рахунак-фактура, дагавор).

Падаць заяўку на крэдыт можна ва ўстановах банка, інтэрнэт-банкінгу, М-банкінгу і на сайце банка.

Парадак выплаты працэнтаў прапісаны толькі за фактычны час карыстання крэдытам, а забеспячэннем крэдыту з'яўляецца яго няўстойка.

Дадзены крэдыт выдаецца ў аддзяленнях банка і праз каналы дыстанцыйнага банкаўскага абслугоўвання дзеяздольным фізічным асобам (грамадзянам краіны, замежным грамадзянам (асобам без грамадзянства)), якія пастаянна пражываюць у нас і маюць даход у нашай краіне або ў арганізацыях Расійскай Федэрацыі (іншых дзяржаў), якія адносяцца да інтэграцыйных аб'яднанняў на постсавецкай прасторы, пералічаных на вэб-сайце Міністэрства замежных спраў.

### ДАКУМЕНТАЎ НЯШМАТ

У банкаўскім аддзяленні ў вас папросяць дакумент, які сведчыць асобу заяўніка. Другім будзе афіцыйная папера, якая пацвярджае даходы кліента: даведкі аб даходах (па даручэнні грамадзяніна фарміруецца выпіска з рахунку, адкрытага ў ААТ «ААБ Беларусбанк», на які залічваецца Даход).

Потым патрэбныя розныя згоды крэдытаатрымальніка на прадстаўленне крэдытнай спраўваздачы з крэдытнага рэгістра, на прадстаўленне інфармацыі аб наяўнасці звестак у інфармацыйных рэсурсах, якія знаходзяцца ў падпарадкаванні МУС; на прадстаўленне інфармацыі з інфармацыйнага рэсурсу АРІП; на апрацоўку персанальных даных пры аказанні электроннай паслугі ААІС «Прадастаўленне звестак аб датах прыёму і звальнення застрахаванай асобы і сумах выплат, на якія налічаны страхавыя ўзносы». Пры фінале выдачы крэдыту патрэбны дакументы на аплату кошту тавараў (работ, паслуг) (дагавор з яго копіяй, рахунак-фактура і іншыя).

Для індывідуальных прадпрымальнікаў дадаткова неабходна прад'явіць арыгінал ліцэнзіі (пры наяўнасці) пасведчання аб дзяржаўнай рэгістрацыі з яго копіяй; звесткі аб даходах ІП за апошнія шэсць месяцаў, папярэднія месяцу звароту па крэдыт; даведка аб руху грашовых сродкаў па рахунку за апошнія шэсць месяцаў, аб наяўнасці/адсутнасці абмежаванняў па бягучым (разліковым) банкаўскім рахунку.

Дарэчы, трэба памятаць, што тэрмін дзеяння дакументаў, якія пацвярджаюць даходы, — 30 каляндарных дзён пасля іх выдачы (афармлення).

### НА ТРЫ МЕСЯЦЫ — АМАЛЬ БЕЗ ПРАЦЭНТАЎ

Яшчэ адна фінансавая структура вырашыла падтрымаць айчыннага вытворцу. Белінвестбанк пад дэвізам «Купляйце Беларускае» стварыў крэдыт пад назвай «Сваё. Роднае». Дадзены фінансавы прадукт разлічаны на беларускія тавары, работы і паслугі. Характэрна, што працэнтная стаўка гэтага крэдыту за першыя тры месяцы (уключна) складзе 0,01 %, а з чацвёртага месяца — 12,52 % гадавых.

Тэрмін крэдыту — 7 гадоў, калі існуе адтэрміноўка выплаты асноўнага доўгу 2 гады. Максімальная сума крэдыту — зыходзячы з крэдытаздольнасці заяўніка. Атрымліваецца, што гэты крэдыт будзе вельмі дарэчы тым кліентам, якія за тры месяцы разлічваюць цалкам пагасіць яго ці збіраюцца атрымаць на рукі значна больш, чым 12 тысяч рублёў.

Выгляд выдзялення гэтага крэдыту — неаднаўляльная крэдытная лінія тэрмінам дзеяння 1 год. Спосабам забеспячэння дадзенага прадукту з'яўляецца няўстойка пры суме да 20 тысяч рублёў. Калі крэдыт большы за гэтую суму — тады абавязковая няўстойка будзе суседнічаць з паручыцельствам іншых фізічных асоб. Для заяўнікаў, якім 60 гадоў (жанчыны), 65 гадоў (мужчыны), няўстойка і паручыцельства неабходныя незалежна ад памеру крэдыту.

### ПАВАЖАЦЬ СЯБЕ ТРЭБА... РУБЛЁМ

Банкаўскія прадукты, якія вылучаюць тавары айчыннага вытворцы, пераарыентуюць насельніцтва на куплю сваіх родных брэндаў, якія досыць канкурэнтныя з імпартнай прадукцыяй. Для стымулявання продажаў вытворцы заўсёды актыўна ўкаранялі розныя фінансавыя інструменты. Магчымасць выдачы льготных крэдытаў на куплю нацыянальных тавараў стала дадатковым імпульсам для актывізацыі спажывецкага попыту, упэўнены міжгаліновыя прафсаюзы краіны.

Мэблевыя фабрыкі апошнім часам, нарасціўшы аб'ёмы вытворчасці, але для развіцця ім патрэбны значныя абаротныя сродкі. Кіраўнікі гэтых вытворцаў лічаць, што пастанова вельмі своечасовая: ёю даюцца прывабныя ўмовы крэдытавання для насельніцтва, а гэта можа істотна павялічыць продаж мэблі ў нашай краіне.

Эканамісты-практыкі лічаць, што такім чынам мы паступова прывучаем нашых людзей набываць айчынную прадукцыю і ганарыцца тым, што яны купілі якасныя тавары. Эксперты нават прапануюць пашырыць дадзенае рашэнне і даваць крэдыты па нізкіх стаўках на набыццё больш шырокай групы тавараў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# А Ў ГЭТЫ ЧАС...

## Ашуканцы «разыгрываюць» прызы, але нічога не падораць і пакінуць вас без грошай

**У перыяд зімовых святаў традыцыйна ўзрастае актыўнасць фінансавых злачынцаў, якія з дапамогай фішынгавых старонак імітуюць сапраўдныя рэсурсы Беларусбанка, і абвяшчаюць там аб правядзенні навагодніх акцый з розыгрышам грашовых прызоў і каштоўных падарункаў. Жадаючыя прыняць удзел і атрымаць нібыта гарантаваны прэзент ад банка рызыкуюць скампраметаваць свае асабістыя дадзеныя і пазбавіцца грошай.**

Злачынная схема працуе так: спачатку зламыснікі ствараюць фэйкавую старонку афіцыйнага сайта банка. Каб яе было цяжка адрозніць ад арыгінала, яны цалкам капіруюць візуальнае афармленне рэальнага рэсурсу, а таксама прыдумляюць даменнае імя, максімальна падобнае на сапраўдны адрас сайта. Розніца можа быць усяго толькі ў адным або некалькіх сімвалах — літарах, лічбах. Як правіла, спасылка на рэсурс-падробку распаўсюджваецца праз сацыяльныя сеткі (instagram, facebook, vk і іншыя), а таксама рэкламныя аб'явы ў папулярных пошукавых сэрвісах (Google, Яндэкс і таму падобных). На зробленай фэйкавай старонцы ашуканцы размяшчаюць навіну аб тым, што банк нібыта запусціў навагоднюю (паслянавагоднюю) акцыю і кожны ее ўдзельнік атрымае гарантаваныя грашовыя прызы, а таксама іншыя каштоўныя падарункі. Падробленая акцыя дзейнічае, нібыта, з 1 снежня па 30 студзеня.

Той, хто зацікавіўся «бясплатным сырам», клікаюць на прапанаваную ім спасылку або кнопку і такім чынам трапляюць на падробленую старонку ўжо сістэмы «Інтэрнэт-банкінг». Там яны бачаць інфармацыйнае паведамленне, якое абвяшчае, што для атрымання прыза неабходна ўвайсці ў свой асабісты кабінет — увесці лагін, пароль і код бяспекі. На справе форма, якая запаўняецца карыстальнікамі, у асабісты кабінет не вядзе, а выкарыстоўваецца зламыснікамі для збору персанальных даных грамадзян. Маючы гэтую інфармацыю, ашуканцы атрымліваюць доступ да грашовых сродкаў трымальнікаў карт і ўладальнікаў рахункаў.

Улічваючы гэта, банк у чарговы раз просіць сваіх кліентаў заўсёды даведвацца пра акцыі, якія праводзіць Беларусбанк, толькі на афіцыйным сайце банка https://belarusbank.by (https://asb.by) і ў афіцыйных групах банка ў сацыяльных сетках:

- instagram (https://www.instagram.com/asb.belarusbank);
- instagram — бізнес-рахунак (https://www.instagram.com/business.asb);
- facebook (https://www.facebook.com/asb.belarusbank);
- facebook — бізнес-рахунак (https://www.facebook.com/business.asb);
- telegram (https://by.tgstat.com/channel/@belarusbank_channel);
- vk (https://vk.com/asb.belarusbank);
- Аднакласнікі (https://ok.ru/asb.belarusbank);
- tiktok (https://www.tiktok.com/@belarusbank.by?lang=ru-RU).

Каб не пацярпець ад махлярства і прадухіліць падобныя выпадкі, варта памятаць, што небяспечна пераходзіць па сумніўных спасылках і ўводзіць там сваю персанальную інфармацыю: імя, тэлефон, пашпартныя дадзеныя, лагіны, паролі, рэквізіты плацежных карт, коды доступу, сеансавыя ключы і іншую інфармацыю, што атрымліваецца з SMS-паведамленняў. Акрамя таго, неабходна перапраўляць карэктнасць адрасоў сайтаў, якія наведваюцца.

А адрас інтэрнэт-банкінгу Беларусбанка — ibank.asb.by. Трапіць у інтэрнэт-банкінг можна таксама з галоўнай старонкі сайта belarusbank.by, клікнуўшы на кнопку прамога доступу.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# СВЯТЫ ПА ФОРМЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Салдаты злучэння нават у святы з гонарам выконваюць свой воінскі абавязак. Аднак сустрэць Новы год у больш прыемнай абстаноўцы ўсё ж такі ўдалося. Так, напрыклад, яшчэ да самой урачыстасці ваеннаслужачыя навялі парадак у казарменных памяшканнях, упрыгожылі навагоднюю ёлку. 31 снежня былі арганізаваны і накрыты святочныя сталы. І чаго на іх толькі не было! Бульба, курыца, салата «Аліўе», розныя нарэзкі, бутэрброды, мандарыны, цукеркі — усё смачна, як дома. Ды і хто б мог падумаць, што сустракаць Новы год у такой незвычайнай абстаноўцы будзе так весела? Ваеннаслужачыя зенітнай ракетна-артылерыйскай батарэі падрыхтавалі гумарыстычныя сцэнкі — пароды на сваіх сяржантаў і камандзіраў, а таксама вясёлыя конкурсы, каб гэтая навагодняя ноч запомнілася надоўга.



Асабліва прыемна вайскоўцам было атрымаць віншаванні ад іх камандзіраў і начальнікаў. Нам, салдатам, яны падарылі смачныя тарты. А для нас і няма большай радасці, чым пачуць прыемныя словы ад самых блізкіх у арміі людзей, бо яны, вобразна кажучы, — нашы вайсковыя мамы і таты. Менавіта да іх заўсёды звяртаешся па параду або з просьбай. Гэтыя людзі заўсёды прыйдуць на дапамогу!

Ваеннаслужачы зенітнай ракетна-артылерыйскай батарэі гвардыі радавы Сямён Глябко, які з горада Полацка Віцебскай вобласці, вырашыў па-свойму парадаваць



сваіх таварышаў. Ён павіншаваў іх вершам. «У мяне быў выдатны навагодні настрой, і дзесьці за тыдзень да ўрачыстасці вырашыў напісаць верш, каб ад усяго сэрца павіншаваць родную зенітную батарэю са святам», — распавёў гвардыі радавы Глябко.

Па словах гвардзейца, у яго ёсць немалы вопыт у напісанні вершаў. Аднак малады чалавек пакуль што яшчэ не гатовы дзяліцца імі з масавай аўдыторыяй — усяму свой час. «Мне было вельмі прыемна бачыць задаволеныя, шчаслівыя твары сваіх таварышаў, якія добра ацанілі маё сціплае віншаванне», — дадаў ён.

«...Ешьте, пейте до отвала,
Набивайте брюхи браво.
С Новым годом, парни, вас,
Вы зенитка — высший класс!»

Яшчэ з Полацкага кадэцкага вучылішча ў Сямёна з'явіліся думкі аб скачках з парашутам. «Таму, калі ў ваенкамаце майго горада ў мяне спыталі, куды б я хацеў трапіць, то без ваганняў адказаў — у Сілы спецыяльных аперацый. Я вельмі папрасіў служыць менавіта ў 103-й брыгадзе, і мне пайшлі насустрач, чаму я асабліва рады!» — распавёў ён.

Ваеннаслужачы зенітнай ракетна-артылерыйскай батарэі гвардыі радавы Алег Аземша з горада Мінска адзначыў, што яму падабаецца служыць у войску. «Асабліва я рады таму, што мяне размеркавалі менавіта ў зенітную батарэю. Гвардыі старшы лейтэнант Арцём Цвяткоў — найлепшы камандзір батарэі, строгі, але ў той жа час справядлівы. Акрамя таго, у нас дружны, зладжаны калектыў», — заўважыў ён.

Да прызыву на тэрміновую службу Алег скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, па спецыяльнасці ён радыёфізік. За перыяд навучання ў ВНУ прайшоў курс падрыхтоўкі малодшых камандзіраў на ваенным факультэце БДУ. Будучы камандзір не толькі ўмела камандуе асабовым складам, але і ўзяў на сябе афармленне і падрыхтоўку святочнага стала.

«Я сам выказаў жаданне арганізаваць стол. Па-першае, як-ніяк камандзір, а па-другое, вельмі люблю гатаваць. Спачатку апытаў таварышаў па службе, каб высветліць перавагі ў ежы кожнага. Пасля чаго склаў меню з улікам пажаданняў салдат. Затым удакладніў неабходную колькасць прадуктаў для таго, каб дакладна ўсім хапіла. Разам з салдатамі кантрактнай службы адправіўся ў краму па пакупкі. У асноўным нам патрэбны былі хлеб, батон, намазка, «ікрынка», шпроты, каўбасы, а таксама безалкагольныя напоі і сокі. Разам з таварышамі падрыхтавалі салаты, розныя бутэрброды і іншыя стравы», — падзяліўся гвардыі радавы Аземша.

Да прызыву Алег паспеў размеркавацца і папрацаваць у прыватнай IT-кампаніі інжынерам-праграмістам. Пасля службы плануе працягнуць развівацца ў гэтай сферы. Дома маладога чалавека вельмі чакаюць бацькі і каханая дзяўчына.

Вайсковец зенітнай ракетна-артылерыйскай батарэі гвардыі радавы Максім Асіповіч, які родам з горада Маладзечна Мінскай вобласці, таксама ўпершыню сустрэў Новы год у казарме. Да прызыву скончыў Маладзечанскі дзяржаўны каледж па спецыяльнасці «Электраманцёр па рамонце і абслугоўванні электраабсталявання. Электразваршчык ручной зваркі» і паспеў папрацаваць у Маладзечанскіх электрасетках філіяла «РУП Мінскэнерга».

«Мне пашанцавала, што размеркавалі менавіта ў зенітную батарэю, таму што ў нас крутыя камандзір батарэі, сяржанты і калектыў. Навагодні настрой быў на найвышэйшым узроўні, бо з нецяр-



пеннем чакаў Новы год. Рады быў прыняць актыўны ўдзел у гумарыстычнай сцэнцы, а таксама прапанаваў таварышам праспяваць навагоднія песні. Святочны стол быў напоўнены максімальна, больш за ўсё мне спадабаліся салаты і торты. Чаканні ад свята апраўдаліся на ўсе 100 %, нягледзячы на нязвыклую абстаноўку», — адзначыў гвардыі радавы Асіповіч.

Пасля заканчэння службы малады чалавек плануе перабрацца ў сталіцу, уладкавацца на працу ў ААТ «Мінсктэлекамбуд». «Дома мяне чакаюць любімыя мама, тата і малодшая сястрычка Ева. Я ўсіх вельмі люблю і сумую па іх», — падагульніў Максім.

Такі незвычайны Новы год запомніўся не толькі новаму папаўненню. Не скупіліся на эмоцыі і прадстаўнікі старэйшага прызыву. Так, напрыклад, ваеннаслужачы зенітнай ракетна-артылерыйскай батарэі гвардыі яфрэйтар Генадзь Булаты з горада Стоўбцы Мінскай вобласці таксама вырашыў падзяліцца сваімі ўражаннямі: «Быў цудоўны навагодні настрой. Асабліва парадавалі сцэнкі і конкурсы. Малодшы перыяд сапраўды пастараўся на славу, яны — вялікія малайцы, у якіх мы ніколі не сумняваліся. Акрамя таго, прыемным здзіўленнем стала тое, што многія вайскоўцы вырашылі самі спяваць навагоднія песні. Шыкоўны стол, вясёлыя сцэнкі, конкурсы, выкананне песень — усё гэта сапраўды стварыла святочны настрой, якога так хацелася. Я назаўжды запомню Новы 2024 год, які я правёў амаль як дома, толькі замест блізкіх — баявыя таварышы, якія за гэты час паспелі стаць самымі роднымі», — падзяліўся гвардыі яфрэйтар Булаты.

Пасля заканчэння службы Генадзь плануе звязаць сваё жыццё з аховай правапарадку — уладкавацца ў Дэпартамент аховы МУС. Дома яго чакаюць мама і старэйшы брат.

З вялікай павагай і трапятаннем застылі вайскоўцы каля тэлевізара. Там — навагоднее віншаванне Прэзідэнта. Пасля яго па стойцы смірна салдаты слухалі і падпявалі гімн нашай краіны. Нягледзячы на арганізацыю, якая была на найвышэйшым узроўні, весялосць, конкурсы і песні, святочны стол і сцэнкі — ужо пасля дванаццаці пачало цягнуць на сон. Гэта ўсё рэжым дня, які «намякае»: хопіць гуляць і адпачываць, хутка новы дзень, а сапраўднаму салдату заўсёды трэба быць гатовым да ўсяго. Правільна ж кажуць, што ёсць такая прафесія — Радзіму абараняць! Адстойваць любімую краіну і мірнае неба ваеннаслужачыя легендарнай 103-й асобнай паветрана-дэсантнай брыгады гатовыя заўсёды: у любы час дня і ночы, па святах, па выхадных і ў будні, бо «ніхто, акрамя нас!»

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ,**
**ваеннаслужачы**
**103-й Віцебскай асобнай**
**паветрана-дэсантнай**
**брыгады.**
**Фота аўтара.**

*г. Віцебск.*

---

Шосты кантынент

# ПАВЕТРАНАЯ ГРУЗАВАЯ АПЕРАЦЫЯ ЗАВЯРШЫЛАСЯ ПАСПЯХОВА...

## На палявую базу Беларускай антарктычнай станцыі дастаўлена 37 тон генеральнага грузу

**Супрацоўнікамі 16-й Беларускай антарктычнай экспедыцыі 5-7 студзеня ў аўральным кругласутачным рэжыме была праведзена паветраная грузавая аперацыя па дастаўцы генеральнага грузу і супрацоўнікаў Беларускай антарктычнай экспедыцыі з борта навукова-даследчага судна «Акадэмік Фёдараў» на палявую базу «Гара Вячэрняя». Пра гэта паведаміў начальнік 16-й Беларускай антарктычнай экспедыцыі (16-я БАЭ) Аляксей ГАЙДАШОЎ.**

«Правядзенне паветранай грузавой аперацыі ўскладнялася цяжкай лядовай абстаноўкай і вялікім плячом палёту верталёта. У працэсе грузавой аперацыі з борта навукова-даследчага судна «Акадэмік Фёдараў» на палявую базу «Гара Вячэрняя» дастаўлена 37 тон генеральнага грузу БАЭ, уключаючы канструкцыі ўстановачнай платформы для новага аб'екта Беларускай антарктычнай станцыі, расходныя матэрыялы і запасныя часткі да тэхнікі, прадукты



харчавання і навуковае абсталяванне. Генеральны груз БАЭ дастаўлены з борта судна «Акадэмік Фёдараў» на палявую базу «Гара Вячэрняя» без пашкоджанняў і страт. Паспяховаму правядзенню паветранай грузавой аперацыі садзейнічала дэталёвае планаванне работ і дакладнае прафесійнае ўзаемадзеянне паміж супрацоўнікамі БАЭ, членамі экіпажаў навукова-даследчага судна і авіятрада, — праінфармаваў кіраўніцтва Нацыянальнай акадэміі навук Аляксей Гайдашоў. — Прыборы для навуковых назіранняў, сістэмы жыццезабеспячэння, сродкі транспарту і сувязі працуюць у штатным рэжыме. Асабовы састаў 16-й антарктычнай экспедыцыі працягвае выкананне зацверджаных НАН Беларусі навуковых праграм, планаў тэхнічных работ і прыродаахоўных мерапрыемстваў. На палявой базе БАЭ «Гара Вячэрняя» ёсць неабходныя запасы паліва, прадуктаў харчавання, медыкаментаў. З замежнымі антарктычнымі станцыямі, міжнароднымі каардынацыйнымі цэнтрамі, бортам навукова-даследчага судна «Акадэмік Фёдараў» падтрымліваецца ўстойлівая спадарожнікавая сувязь. Асабовы састаў экспедыцыі — здаровы».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
**Фота ўдзельнікаў 16-й БАЭ.**

# РУБЛЁМ ЦІ СУМЛЕННЕМ

## Матываваць беларусаў на дбайнае стаўленне да ўласнага смецця

**Да 2025 года ўзровень выкарыстання адходаў у Беларусі павінен дасягнуць 64 %, а да 2035-га — 90 %. Каб гэта адбылося, адных дырэктыўных планавых намаганняў «зверху» мала. Неабходна (як бы пафасна гэта ні гучала), каб кожны беларус усведамляў, што колькасць адходаў, якія будуць ствараецца ўвогуле, а таксама — якія з іх будуць вывозіцца на палігоны, а якія — перапрацоўвацца, залежыць у тым ліку ад яго асабістага стаўлення да смецця. Кропля камень точыць, памятаеце? Набыць тканевую торбу-шопер замест бясконцых пластыкавых пакетаў, не ўгортваць у пакецікі штучна набытыя мандарыны, цыбуліны ці сыркі, не ленавацца выкідаць смецце ў адпаведныя кантэйнеры, не звальваючы іх у адну сметніцу. Гэта тое, што навідавоку, што зрабіць вельмі проста кожнаму з нас. А вось як з адходамі «змагаюцца» і абыходзяцца на ўзроўні краіны, якія наступствы чакаюць планету ад часта бяздумнага спажывецкага ўжытку, чаму немагчыма цалкам перайсці на экаўпакоўку, расказалі эксперты.**



### Эканамічныя і папераджальныя стымулы для ўпакоўкі

З 2012 года ў Беларусі ўкаранілі прынцып пашыранай адказнасці вытворцаў, хоць нейкія падобныя механізмы існавалі яшчэ з 2002-га. Прынцып мае на ўвазе, што адказнасць за абарачэнне з адходамі, якія ўтвараюцца пасля страты таварамі сваёй спажывецкай якасці, перакладаецца на вытворцаў і імпарцёраў гэтых тавараў, нагадала **Надзея АРЭШКА, намеснік дырэктара дзяржаўнай установы «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў»:**

— Вытворцы і імпарцёры, якія ўвозяць у краіну нейкія спажывецкія тавары, у тым ліку і ўпакоўку, абавязаны або самастойна забяспечыць збор адходаў такога ж віду ў поўнай колькасці (для пластыку, напрыклад, гэта палова ад увезенай колькасці), або ўнесці плату за арганізацыю збору гэтых адходаў. Сродкі акумулююцца і накіроўваюцца на развіццё сістэмы абыходжання з адходамі ў краіне. Такім чынам створаны эканамічныя стымулы для павелічэння збору адходаў, у тым ліку часткова і для прадухілення іх стварэння.



Вызначаны розныя памеры платы, якую ўносяць вытворцы і пастаўшчыкі. Яны зменшаны, напрыклад, для папяровых пакетаў, якія могуць выкарыстоўвацца замест палімерных у параўнанні з усёй папяровай упакоўкай. Менш плацяць і за біяраскладальную ўпакоўку, каб стымуляваць вытворцаў выбіраць той прадукт, які наносіць менш шкоды наваколлю, прывяла прыклады спецыяліст ДМР:

— За кошт сродкаў, якія збіраюцца, ствараюцца таксама дадатковыя механізмы ў дачыненні да арганізацый, якія займаюцца абыходжаннем з адходамі, нарыхтоўчых арганізацый. Напрыклад, уведзена кампенсацыя расходаў па зборы і выкарыстанні шматабаротнай шкляной упакоўкі, што адначасова спрыяе прадухіленню ўтварэння адходаў. Летась было кампенсавана гэткім чынам практычна дзевяць мільёнаў бутэлек, то-бок прадухіліць стварэнне такога аб'ёму адходаў.

Існуюць таксама механізмы для замены непажаданых матэрыялаў — напрыклад, прадугледжана кампенсацыя для вытворцаў напояў і малака за розніцу сваёй прадукцыі ў шкляную тару, бо яна прасцей перапрацоўваецца. У краіне ўжо адзначаецца станоўчая дынаміка ў выкарыстанні шкляной тары для гэтых мэтаў. Летась да Аператара звярнуліся за кампенсацыяй прыкладна 118 тысяч бутэлек, а за няпоўны год сёлета — ужо больш як 540 тысяч штук, то-бок павелічэнне больш як у чатыры разы.

Ключавы паказчык у сферы абыходжання з адходамі — узровень іх выкарыстання. Летась ён быў 34 %, а дзесяць гадоў таму — усяго 10 %. Грошы, якія выплачваюць вытворцы і імпарцёры, дазваляюць Аператару інвесціраваць у аб'екты па абыходжанні з адходамі. Аднак толькі за кошт збору і выкарыстання другасных матэрыяльных рэсурсаў (ДМР), дакладней тых іх відаў, якія можна перапрацаваць у прадукцыю, узровень выкарыстання не павысіць, пераканана Надзея Арэшка:

— У рамках Нацыянальнай стратэгіі па абыходжанні з адходамі да 2035 года і дзяржпраграм па абыходжанні з адходамі рэалізуюцца мерапрыемствы, скіраваныя на развіццё іншых кірункаў. Напрыклад, кампаставанне арганічнай часткі адходаў, выраб РДФ-паліва для цэментных заводаў з адходаў, якія не могуць быць адсартаваны і перапрацаваны як другасная сыравіна (у тым ліку частка пластыку, які не падлягае перапрацоўцы).

### Шкляная рознакаляровасць і папяровая экалагічнасць

Шкло — матэрыял, які на 100 % паддаецца рэцыклінгу і пасля перапрацоўкі якога не застаецца пабочных матэрыялаў. Кожныя 100 перапрацаваных кілаграмаў шкла эканомяць больш за 1000 кілаграм прыродных матэрыялаў, у тым ліку 200 кіло вапняку, каля 180 кіло соды і больш як 600 кіло пяску, расказалі эксперты.

— Аднак у савецкія часы шкляная бутэлька была літаральна чатырох тыпапамераў і яе можна было збіраць і шматабаротна выкарыстоўваць. Зараз у нас поўная рознакаляровасць у бутэльках: ад празрыстасці да сіні і зялёнасці. І калі проста сабраць гэта «да кучы», то атрымаем шэра-бура-малінавае шкло. Так што не праблема перапрацаваць, але пытанне, як гэта выкарыстоўваць паўторна, — узняў пытанне **Валерый ГАНЧАРОЎ, дырэктар Цэнтра сістэмнага аналізу і стратэгічных даследаванняў НАН Беларусі.** — Адказнасць, якая перакладзена на вытворцаў, яны кампенсуюць у кошце прадукцыі, і ўрэшце яна перакладаецца на пакупніка, які і кампенсуе гэтыя затраты вытворцаў на аплату яго пашыранай адказнасці. Мяркуючы ж па кампенсацыі, па якую звяртаюцца вытворцы, шкляная бутэлька, што выкарыстоўваецца паўторна, павінна была ўжо патанець у некалькі разоў, але ж гэтага не адбываецца.

Так, фактычна свае затраты вытворца закладвае ў кошт прадукту. Але гаворка найперш не пра змяншэнне сабекошту прадукту, а пра тое, каб уздзейнічаць на вытворца эканамічнымі метадамі, каб ён прымаў рашэнне на карысць больш прыдатнага для перапрацоўкі матэрыялу. Вытворцу кампенсуецца розніца паміж коштам пластыкавай бутэлькі і коштам шкляной, заўважыла на гэта Надзея Арэшка:

— У кожнага спажыўца ёсць выбар, ці хоча ён несці адказнасць за будучыню прыроды сваёй краіны і свету ў цэлым. Калі хоча, то, вядома, ён пераплаціць, але ж набудзе тавар у шкляной бутэльцы ці шматабаротнай тары. Аднак заўжды будуць людзі, якім усё роўна і якія будуць выбіраць больш танны прадукт і не думаць пра наступствы ад яго ўпакоўкі.

Свой унёсак на шляху змяншэння выкарыстання палімернай упакоўкі і яе замяшчэння экалагічна бяспечнай робіць і канцэрн «Беллеспаперпрам», у прыватнасці яго цэлюлозна-папяровая галіна.

Дзесяць прадпрыемстваў канцэрна за 2022 год выраблілі 440 тысяч тон паперы і кардону. Ствараюць таксама гафрыраваны кардон для транспартыроўкі розных відаў прадукцыі (175 тысяч тон). На базе Добрушскай папяровай фабрыкі з 2021-га працуе завод па вырабе шматслойнага мелаванага і немелаванага кардону (вырабіў 150 тысяч тон за 2022-і). А Кіруючая кампанія холдынга «Беларускія шпалеры» пачала замяняць пластыкавыя кубачкі папяровымі. Лінія здольная выраблаць за год 185 тысяч тон такой прадукцыі (найбольш запатрабаваныя памеры ад 110 да 450 мл) і ствараць як аднасценныя кубачкі, так і двухсценныя, падзяліўся **Аляксандр КАЗАКЕВІЧ, галоўны спецыяліст упраўлення цэлюлозна-папяровай і лесахімічнай вытворчасці Беларускага вытворча-гандлёвага канцэрна лясной, дрэваапрацоўчай і цэлюлозна-папяровай прамысловасці:**

— У бліжэйшым пяцігоддзі плануецца паэтапная рэалізацыя некалькіх інвестпраектаў, сярод якіх — будаўніцтва і ўстаноўка новай папераробчай машыны па вырабе крафт-мяшэчнай паперы на пляцоўцы Светлагорскага цэлюлозна-кардоннага камбіната. Плануецца, што праект будзе рэалізаваны ў 2024-м.

### Плаціць і выхоўваць

Своеасаблівымі матыватарамі для людзей ставіцца да смецця больш дбайна з'яўляюцца і нарыхтоўшчыкі другаснай сыравіны, якія прымаюць яе ў спажыўца за грошы. За 2022-і нарыхтоўчыя арганізацыі спажывецкай кааперацыі закупілі 3,2 тысячы тон пластыку. Аднак больш грунтоўнае і надзённае пытанне — мінімальнае дапушчэнне нераскладальнага пластыку на тэрыторыю Беларусі, заўважыла **Аксана СКІНДЗЕР, начальнік упраўлення нарыхтовак Беларускага рэспубліканскага саюза спажывецкіх таварыстваў «Белкаапсаюз»:**

— На жаль, асноўнымі абмежавальнымі мерамі ў нас займаюцца спецыялісты Дзяржстандарта, якія працуюць над пакетам дакументаў, каб мінімізаваць паступленне гэтага пластыку ў рэспубліку. І тое — гэта робіцца толькі апошнія гады, бо вельмі працазатратна. Мала інфармацыі, напісанай проста і зразумела для насельніцтва, што канкрэтна ім рабіць і як ім быць максімальна зацікаўленымі.

Яна нагадала, што спецыялісты расказваюць, як дрэнна, калі пластыкавае смецце трапляе ў кантэйнеры са звычайнымі адходамі і вывозіцца на звалку; як цяжка збіраць пластык асобна і пасля перапрацоўваць яго; як гэта шкодна для прыроды. Аднак ніхто не задумваецца, што хтосьці атрымлівае грошы ад упакоўкі, якая ўвозіцца ў краіну і якая не раскладаецца і не падлягае наступнай перапрацоўцы.

— Мы кажам, як матывуем вытворцаў, якія выпускаюць свой прадукт у шкляной тары, але ж сёння існуе толькі некалькі відаў шклатары, якія зваротныя, і для іх далейшага выкарыстання прадуманы гэты механізм. То-бок мы зрабілі адзін крок, але не зрабілі ўсе наступныя, каб завяршыць гэты ланцужок па шматабаротнай тары.

Аксана Скіндзер пераканана, што работы, якая праводзіцца з насельніцтвам, недастаткова. На яе думку, найбольш прыдатная аўдыторыя для ўсведамлення важнасці пытання збору ДМР, — людзі, народжаныя ў 40—60-я гады мінулага стагоддзя і, вядома, новае пакаленне — цяперашнія школьнікі, якія здольныя паўплываць на сваіх бацькоў.

— Арганізацыі спажывецкай кааперацыі шмат працуюць са школамі. У 2022-м мы заплацілі школьнікам за здачу больш як 200 тон пластыку (бутэлек, крышачак). Пры гэтым вучні разумелі, што ўсё, што яны сабралі, — не вярнулася ў экалагічнае асяроддзе. А яшчэ — што гэта спосаб зарабіць (эканоміка).

Хлебная прамысловасць арганізацый спажывецкай кааперацыі працэнтаў на 60-70 перайшла з пластыкавай упакоўкі на папяровую. А ў кропках грамадскага харчавання па ўсёй краіне, дзе гатуюць стравы на вынас, таксама назіраецца станоўчая дынаміка — у параўнанні з 2020-м у пяць разоў павялічылася выкарыстанне папяровай упакоўкі, якая можа перапрацоўвацца і выкарыстоўвацца далей, дадала спецыяліст.



Аднак існуюць яшчэ сацыяльныя групы тавараў, якія ўпакоўваюцца ў танную палімерную тару, і гэта момант сацыяльнай адказнасці, які трэба размяжоўваць. Значыць, адзіна правільнага падыходу няма — трэба гнутка падстройвацца ў іх дачыненні. А яшчэ пакольки кошт упакоўкі ўсё роўна закладваецца ў цану тавару, то было б добра, калі б спажывец мог зрабіць у краме выбар на карысць умоўна бясплатнага пластыкавага пакета ці ўмоўна бясплатнага папяровага, падсумавалі эксперты.

**Ірына СІДАРОК.**
**Фота аўтара.**

Проста — аб складаным

# МЕДЫЦЫНА БУДУЧЫНІ І ЭФЕКТЫЎНАЯ КАМУНІКАЦЫЯ

## У сталіцы прайшоў пяты, юбілейны, «Інавацыйны шторм»

**Што такое эканоміка ўражанняў, і як зрабіць нацыянальны турыстычны прадукт больш канкурэнтаздольным? Ці рэальна з невялікага стартапа выбудаваць буйную сетку з прадстаўніцтваў у Мінску, рэгіёнах і выйсці за межы краіны? Як штучны інтэлект прымяняецца ў банкаўскай сферы, і якія этычныя праблемы паўстаюць пры яго паўсюдным укараненні? Адказы на гэтыя і іншыя пытанні атрымалі ўдзельнікі форуму навукі і бізнесу «Інавацыйны шторм», арганізаванага Мінскім гарадскім тэхнапаркам пры падтрымцы Мінгарвыканкама.**

Мэта мерапрыемства — папулярызацыя інавацыйнага прадпрымальніцтва, навуковай дзейнасці, спаборніцтва ідэй і поглядаў для далейшага развіцця інавацыйнай інфраструктуры і фарміравання інавацыйнай супольнасці.

Галоўны прынцып форуму — «Складаныя паняцці простымі словамі»: у нефармальнай абстаноўцы прадпрымальнікі і навукоўцы даступна расказваюць аб тэхналогіях і інавацыях, якія ў хуткім часе могуць карэнным чынам змяніць наша з вамі жыццё. Форма стасункаў з залай прадугледжвала кароткія выступленні і пытанні да спікераў.

### Ідэя ў адным сказе

**«Як прадаць сваю экспертнасць, прадукт, ідэю: схема эфектыўнай камунікацыі». Так сфармуляваў тэму свайго выступлення кансультант па аратарскім майстэрстве, падрыхтоўцы прэзентацый, выкладчык MBA, радыёжурналіст, спікінг-коуч канферэнцыі TEDx Дзмітрый СМІРНОЎ.**

— Сёння мы пагаворым пра тое, як данесці сваю думку і як рыхтавацца да любой камунікацыі. Што я назіраю на практыцы: спікер бярэ вельмі шмат інфармацыі, большменш лагічна размяркоўвае яе па слайдах і выплёсквае ўсё гэта на аўдыторыю. Але гэта не працуе... **Рыхтуючыся да публічнага выступлення, пачынаць трэба зусёды з ідэі,** — раіць Дзмітрый. — Чым ідэя адрозніваецца ад тэмы? Ідэя — гэта мая ацэнка, ацэнка спікера да тэмы. Напрыклад, «Форум навукі і бізнесу» — гэта ідэя ці тэма? Тэма. А «складаныя паняцці простымі словамі» — гэта ідэя.

Я часта прысутнічаю на мерапрыемствах, дзе прэзентуюць стартапы. Дык вось, па маіх назіраннях, каля 70 працэнтаў стартапаў не могуць сфармуляваць сваю ідэю ў адным сказе. І я часта чую: «Дзмітрый, у нас вельмі шматгранны складаны прадукт, сутнасць якога немагчыма апісаць адным сказам...» У такім разе ідэіце і думайце (усміхаецца. — **Аўт.**). Вакол ідэі будуецца ўвесь тэкст, і менавіта гэтую думку павінна забраць з сабой аўдыторыя...

Нобелеўская прэмія 2023 года па фізіцы была прысуджана за стварэнне аттасекундных лазераў. Вам зразумела, пра што ідзе гаворка? А калі скажуць, што аттасекундныя імпульсы святла дазваляюць даследаваць рэчыва ў такіх дэталях, якія раней былі недаступныя, становіцца больш-менш зразумела, якое дасягненне было заахвочана прэстыжнай прэміяй.

Няма ідэі, і тэкст рассыпаецца на пазлы. А аўдыторыя можа запомніць зусім не тое, што было важна для спікера, а тое, што ёй прыглянулася. Напрыклад, я прэзентую кампанію, расказваю пра функцыянальнасць прадукту, універсальнасць, высокі ўзровень сэрвісу, індывідуальны падыход, бясплатную духмяную каву ў офісе для кліентаў. Функцыянальнасць, універсальнасць — так можна сказаць пра вельмі многія прадукты. І тады аўдыторыя забярэ з сабой толькі інфармацыю пра бясплатную каву...

### Спікер супраць смартфона

**«Калі мы хочам прэзентаваць сваю ідэю, свой прадукт, трэба адразу зацікавіць,** — дае парады Дзмітрый Смірноў. — «Я з гонарам хачу прадставіць ... « — абсалютна бессэнсоўная фраза. «У сучасным свеце лічбавізацыя пранікла ва ўсе сферы




жыццядзейнасці», «без вывучэння англійскай мовы ў сучасным свеце складана стаць паспяховым спецыялістам» — на такія выразы сёння няма часу. Калі я пачынаў выступаць васямнаццаць гадоў назад, які ў мяне быў канкурэнт? Толькі акно, за якім, напрыклад, мог пайсці снег. А цяпер я канкурырую з усім светам, які ёсць у вашых смартфонах. Таму часу на працягласць уступнае слова няма. Мая задача зацікавіць вас у першыя дзесяць секунд.

**Сенсацыя — гэта тое, што здзіўляе.** Напрыклад, зачапіць могуць лічбы, якія аўдыторыя не ведае. Падчас даследавання ў кіраўнікоў і супрацоўнікаў кампаніі запыталіся: «На вашу думку, стасункі ў вашай кампаніі — карысныя, актуальныя?» З гэтым пагадзіліся 77 працэнтаў кіраўнікоў і толькі 46 працэнтаў падначаленых. Усё, вы зачапілі аўдыторыю новым фактам, які выклікае здзіўленне і падштурхоўвае да аналізу.

Скандал — гэта праблема, выграшэнне любога канфлікту, любое супастаўленне. Я супрацоўнічаў з IT-кампаніяй, якая запрашала слухачоў на курсы для пачаткоўцаў. Думалі, чым можа зачапіць іх прапанова, паколькі курсаў, якія прапануюць канкурэнты, хапае... «Раней я працаваў юрыстам, і мой шлях у IT заняў паўтара года. Зараз, азіраючыся назад, разумею, што той жа шлях я мог прайсці за паўгода. Раскажу вам, як сэканоміць год жыцця...» І аўдыторыя адразу разумее, што хоча слухаць гэтага спікера. Замест доўгіх прыгожых, але пустых фраз, простыя зразумелы канфлікт: паўтара года ці шэсць месяцаў?»

### Размаўляць проста і вобразна

— Калі выступаеце перад аўдыторыяй, пазбягайце пафасу, не трэба пачынаць выступленне з нечага прыгожага, разумнага і вечнага, — раіць кансультант па аратарскім майстэрстве. — Спікер можа казаць ад сябе і пра сябе. Калі ён пажартаваў і слухачы ўсміхнуліся, яны любяць спікера значна больш і гатовы яго даўжэй слухаць. Мова павінна быць простай. Выкідайце ўсе дзеепрыметныя і дзеепрыслоўныя словазлучэнні, нагрувашчанні назоўнікаў, кшталту «ажыццяўленне працэсу перадачы». Нельга казаць: «Я з'яўляюся спецыялістам», ці: «Наша кампанія з'яўляецца лідарам у галіне». З'яўляюцца толькі прывіды і святыя. Трэба казаць: «Я — спецыяліст», «наша кампанія — лідар у галіне. « А замест трох назоўнікаў дастаткова аднаго дзеяслова.

Калі чалавек разбіраецца ў тэме, ён кажа проста і зразумела. Калі мы расказваем пра штосьці, трэба думаць пра тое, якая карцінка складаецца ў галаве слухачоў, таму што людзі думаюць не словамі, а вобразамі...

«Задаволіць патрэбы нават самых патрабавальных», «індывідуальны падыход», «дэмакратычныя цэны», «высокі ўзровень сэрвісу», «выконваем задачы рознага ўзроўню складанасці»... Ці з'яўляюцца ў вас карцінкі?

А вось як кажа нобелеўскі лаўрэат: «Кожны раз, калі я падыходжу да тэлескопа, мяне ахоплівае думка, што святло, якое я бачу, вандравала па Сусвеце 26 тысяч гадоў». Ну як жа прыгожа! А якая карцінка ўзнікае адразу ў галаве ў слухачоў!..

**Аўдыторыя заўсёды «прачынаецца», калі спікер прыводзіць кейсы з уласнай практыкі** ці расказвае, напрыклад, пра тое, як ён прыйшоў да гэтай ідэі (калі размова ідзе пра выступленне на навукова-практычнай канферэнцыі).

Факты, вобраз, кейс, параўнанне... Калі ўсё гэта ёсць у вашым выступленні, то аўдыторыя забярэ з сабой патрэбную вам думку...

### Медыцынскія тату і нанаботы

«Медыцына будучыні» — так гучала тэма выступлення **навуковага рэдактара выдавецкага дома «Рэмедыум», урача-тэрапеўта вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі, лаўрэата конкурсу «Медыцына ў Рунэце» і іншых конкурсаў, аўтара кнігі «Пацыент разумны», аўтара і вядучага радыёпраграм Аляксея ВАДАВОЗАВА.**

— Можна было б сысці ў футурыстыку, але я буду распавядаць аб тых тэхналогіях, якія ўжо прыйшлі ў медыцынскую практыку ці вось-вось прыйдуць, пра будучыню, якая на нашых вачах становіцца рэальнасцю: гэта медыцынскія тату, кіберпратэзы і экзаскелеты, мікра- і нанаботы, ядзерная медыцына, апаратнае ўстараненне сімптомаў хваробы Паркінсона, ксенатрансплантацыя, штучны інтэлект. Агульнавядома, што медыцына складаецца з дыягностыкі і непасрэдна лячэння. Адзін з новых спосабаў дыягностыкі — медыцынскія татуіроўкі. Фактычна размова ідзе пра электронныя прылады, якія замацоўваюцца на скуры, — расказвае Аляксей. — Сучасныя матэрыялы дазваляюць зрабіць татуіроўкі гнуткімі, яны не ламаюцца, і з імі часта можна нават прымаць душ. З наскрынай татуіроўкі можна атрымаць прыкладна 10-15 паказчыкаў. А калі ў татуіроўцы ёсць яшчэ і пагружны датчык, то магчымасці дыягностыкі значна пашыраюцца.




Напрыклад, **электронная «татуіроўка» можа, не дастаўляючы нязручнасцяў, забяспечваць дакладнасць вымярэння крывянога ціску.** Стандартны метад мяркуе на ўвазе выкарыстанне манжэты, абгорнутай вакол перадплечча. Ён дае аднаразовыя паказанні, якія неабавязкова адлюстроўваюць аб'ектыўную карціну і вельмі залежаць ад эмацыйнага стану таго, каму вымяраюць ціск крыві. Бесперапынны маніторынг неабходны для праўдзівай ацэнкі таго, што адбываецца ў арганізме, але па-за клінікай такую ацэнку атрымаць цяжка.

Тэхаскія навукоўцы стварылі малаінвазіўную прыладу, якая можа вымяраць крывяны ціск працяглы час. Гэта электронная татуіроўка. Электронная татуіроўка складаецца з 12 амаль нябачных графенавых палосак, размешчаных у два рады ўздоўж двух асноўных артэрый запясця. Крайнія палоскі кожнага раду пасылаюць невялікія электрычныя сігналы глыбока ў руку. Унутраныя палоскі выяўляюць змены ў крывацёку пры скачках ціску, аналізуючы рэакцыю арганізма. Татуіроўкі добра працуюць падчас шматгадзіннай працы, хады, і нават калі ўдзельнікі апускалі рукі ў вядро з ледзяной вадой. Датчыкі таксама працавалі ўначы, не парушаючы сон носьбітаў.

Ёсць ужо і татуіроўкі-кардыяграмы, якая ўжыўляюцца пад скуру з электродам і рэгіструюць сэрцабіццё. А ў выпадку праблем у сардэчнай дзейнасці могуць нават падаць трывожны сігнал урачу. Важна, што медыцынскія татуіроўкі змогуць кантраляваць стан пацыентаў кругласутачна сем дзён у тыдзень.

Па словах Аляксея Вадавозава, **выкарыстанне мікра- і нанаробатаў лічыцца ў біямедыцыне адным з самых перспектыўных кірункаў.**

Нанаробаты — гэта неверагодна маленькія прылады. Яны звычайна маюць памеры да некалькіх сотняў нанаметраў, іх немагчыма ўбачыць няўзброеным вокам. Нанаробаты могуць выконваць розныя функцыі на ўзроўні малекул і клетак, у тым ліку дастаўку лекаў, рамонт тканак і дыягностыку захворванняў. Напрыклад, нанаробаты можна выкарыстоўваць для дастаўкі лекавых прэпаратаў непасрэдна ў пэўныя ўчасткі арганізма, да тканак і клетак, якія пацярпелі, і зменшыць пабочныя эфекты для ўсяго арганізма. Іх можна запраграмаваць для дастаўкі супрацьпухлінных прэпаратаў непасрэдна да пухліны, мінімізуючы ўздзеянне на здаровыя тканкі. Гэтыя нанаробаты пакрытыя адмысловымі магнітнымі часціцамі, якія дазваляюць ім прымацоўвацца да сценак пухліны.

Таксама нанаробаты могуць быць запраграмаваныя для рамонту пашкоджаных нервовых валокнаў пры траўмах пазваночніка ці для замены пашкоджаных клетак сардэчнай мышцы пасля інфаркту. Такія нанаробаты абсталяваны мікраскапічнымі прыладамі, якія дазваляюць ім выдаляць бляшкі з артэрый і аднаўляць пашкоджаныя сардэчныя мышцы.

Яшчэ адзін перспектыўны напрамак — выкарыстанне нанаробатаў для дыягностыкі захворванняў на ранніх стадыях. Яны могуць мець на мэце на выяўленне пэўных біямаркераў, звязаных з захворваннямі. Паўднёвакарэйскія навукоўцы распрацавалі нанаробатаў, якія могуць распазнаваць ракавыя клеткі. Яны пакрыты спецыяльнымі антыцеламі, якія рэагуюць на малекулы, што прысутнічаюць на паверхні ракавых клетак. Калі нанаробат выяўляе ракавую клетку, ён прымацоўваецца да яе і пасылае сігнал урачу.

### ChatGPT ставіць дыягназ

Шмат этычных пытанняў у медыцыне звязаны з выкарыстаннем штучнага інтэлекту. Шмат шуму нарабіў папулярны чат-бот ChatGPT, створаны на аснове штучнага інтэлекту. Як гучна заяўлялася, гэты універсальны чат-бот ужо здольны сапернічаць з чалавекам у інтэлектуальных і камунікатыўных задачах.

**ChatGPT здаў медыцынскі экзамен United States Medical Licensing Examination (USMLE) на права працаваць урачом у ЗША.** Ён паспяхова адказаў на 88,9 працэнта пытанняў і заданняў тэста з 350 медыцынскіх сітуацыйных задач пры прахадным парозе ў 60 працэнтаў. Гэты тэст лічыцца адным з самых складаных медыцынскіх экзаменаў у свеце.

— Трэба заўважыць, што чат-бот навучалі практыкуючыя ўрачы-эксперты. Адначасова з ChatGPT іспыт USMLE здавала нейрасетка PubMedGPT, навучаная выключна на медыцынскай літаратуры і профільных базах даных. І яна дала толькі 50,8 працэнта правільных адказаў, — падкрэсліве Аляксей Вадавозаў. — Было праведзена яшчэ адно цікавае даследаванне. Пацыентаў размеркавалі па групах, і тыя не ведалі, з кім яны кантактуюць: з рэальным урачом ці з чат-ботам. Высветлілася, што пацыентам больш спадабалася кантактаваць не з жывым урачом, праўда, яны пра гэта не ведалі. Чаму так адбылося? Таму што чат-бот аказаўся больш эмпатычным.

У Вялікабрытаніі быў выпадак, калі за тры гады 17 урачоў не змаглі паставіць хлопчыку правільны дыягназ. А, калі яго маці ўвяла ўсе сімптомы ў ChatGPT, той вынес правільны вердыкт — Spina bifida, расшчэплены пазваночнік, схаваная форма. Рэдкая паталогія, сустракаецца, напрыклад, пры дэфіцыце фаліевай кіслаты на першых стадыях цяжарнасці. Урачы, як вы разумееце, не могуць трымаць у галаве ўсе рэдкія клінічныя выпадкі. А машына можа, таму што ў яе ўсё гэта загрузілі. ChatGPT перабіраў інфармацыю і выйшаў на аналагічны «кейс». Так што з рэдкімі выпадкамі ён спраўляецца даволі няднрэна. Увогуле, узровень дыягностыкі ў ChatGPT на ўзроўні моцнага ардынатара (дакладнасць пастаноўкі дыягназаў 72 працэнты), і, што важна, ён спраўляецца з рэдкімі выпадкамі. Вось такі новы «доктар Хаус»...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**Фота Лізаветы ГОЛАД і арганізатараў.**

# ПАД ПРЫЦЭЛАМ КАМЕРЫ І РЫФМЫ

## Майстэрства паэтызаваць фатаграфію



**Фотааб'ектыў аднаго з найстарэйшых фотамайстроў краіны Яўгена Пясецкага засведчыў тысячы падзей, безліч асоб, шматлікія з'явы прыроды, чалавечыя эмоцыі... Паўстагоддзя таму яго фотаінфармацыі выходзілі і ў газеце «Правда», якая выдавалася ў СССР тыражом пяць мільёнаў экземпляраў. З камандзіроўкамі ён ездзіў па ўсім Саюзе: Камчатка, Благавешчанск, Кіргізія, Туркменія, Белае мора, Мурманск, Архангельск... У прэсе Яўген Віктаравіч амаль 60 гадоў, з якіх больш як 50 — у «Звяздзе». 7 студзеня старэйшы фотажурналістыкі адзначыў 75-гадовы юбілей. Яго здымкі адрозніваюць мастацкасць, глыбіня, непаўторны аўтарскі стыль і... паэтычнасць. Так, Яўген Пясецкі валодае ўнікальнай якасцю — уменнем паэтызаваць фатаграфію. Як назапашвалася майстэрства і як паядналася фота з вершам — у нашай гутарцы.**

***— Яўген Віктаравіч, у адным інтэрв'ю вы згадалі, што ў вашай сям'і заўсёды выпісвалі «Роман-газету». Бацькі з інтэлігенцыі?***

— Мая маці інжынер, бацька — выкладчык малявання. Ён шмат пісаў, засталіся яго карціны. Многа іх было і ў школе, дзе выкладаў, — у пасёлку Зялёны Бор каля Жодзіна. Адначасова працаваў на торфаздабыўным прадпрыемстве — узначальваў інжынерна-чарцёжны вузел. На гэтым жа прадпрыемстве працавала мама.

Бывала, гледзячы на бацьку, браў у рукі пэндзаль і я, атрымлівалася. Але больш прыцягнула іншае: я стаў наведваць школу пазаштатных карэспандэнтаў пры раённай газеце, дзе віравала незвычайная атмасфера. Мае равеснікі, якія тут вучыліся, сталі вядомымі журналістамі. Ігар Асінскі, былы сабкар ТАСС у Берліне, у мінулым звычайны сельскі хлопец. Эльвіра Папатчык, выхаванка нашай школы, пасля стала галоўным рэдактарам раёнкі. Усё таму, што навучаў нас мудры дарадца — загадчык аддзела пісем Іван Трафімавіч Панчанка. Цудоўны нарысіст, аўтар шматлікіх кніг, пісьменнік ад зямлі: у Смалявічах нарадзіўся, вырас, усё жыццё працаваў у раённай газеце, пакінуў пра сябе вялікі след — і ў кнігах, і ў журналістыцы.

Адначасова я закончыў сярэднюю школу і школу пазаштатных карэспандэнтаў. Узялі працаваць у раённую газету. Паступіў на журфак БДУ. У мяне была наладжана добрая сувязь з мінскімі газетамі. Дасылаў у асноўным фотарэпартажы. Спрабаваў сілы ў літаратуры: у раёнцы пабачылі свет мае невялікія апавяданні. Ды пераважаў фотарэпартаж. Мне выдалі маленькі фотаапарат «Зенит». Быў у раёнцы маленькі неацяпляльны пакойчык без акон, дзе паставілі павелічальнік, стол, крэсла, дзе я праяўляў плёнкі, друкаваў здымкі. Многае было не купіць, не дастаць, у прыватнасці гатовыя наборы праяўляльніка, замацавальніка, іншых рэчаў. А ў рэдакцыі пакецікі з хімрэактывамі выпісвалі. Я па рэцэптах узважваў і рабіў. Захоўваліся растворы ў бутлях. Гатовую фотакартку альбо адсылаў поштай, альбо прывозіў. Пісаў спачатку ад рукі, потым авалодаў друкаркай, балазе яна была ў раёнцы. Паралельна супрацоўнічаў з іншымі газетамі, у прыватнасці са «Знамя юности». Дарэчы, напярэдадні прызыву ў армію там вырашалі накont прыёму мяне ў штат. Ды лёс скіраваў у «Звязду»...

***— «Звяздзе» ў выніку вы аддалі паўвека...***

— Атрымалася так, што я прыйшоў на зломе эпох. Працавала тое пакаленне, якое ўвайшло ў газету адразу пасля вайны. Амаль паўсюль фотакарэспандэнтамі былі ветэраны-франтавікі. Асобы заслужаныя сваёй франтавой або партызанскай дзейнасцю. У «Чырвонай змене» быў фотакарэспандэнт Фёдар Апанасавіч Бачыла. Мы пасябравалі. У гады Вялікай Айчыннай вайны ён кіраваў дыверсійнай групы, якая пусціла пад адхон шмат варожых эшалонаў. Прадстаўляўся да звання Героя. Уражваў яго пінжак, поўны ваенных узнагарод. У «Советской Белоруссии» — цудоўны фотакарэспандэнт Леў Ігнатавіч Папковіч. Я адзіны быў сярод іх малады. Да таго ж адзіны, хто вучыўся ў ВНУ. Яны, франтавога прызыву, без адукацыі. Ды і да вайны мець адукацыю журналіста — з'ява даволі рэдкая. Як і пасля — таксама. Тым больш у галіне фотажурналістыкі. У «Звяздзе» разам папрацавалі з фатографам Вячаславам Дубінкам. Ён быў шматгранный асобай. Яго прывабіла сфера літаратуры і народнага мастацтва. У энцыклапедыі Дубінка найперш згадваецца як майстар, які адрадзіў выцінанку. Працуючы ў «Звяздзе», рабіў выстаўкі. Нават у камандзіроўку ён браў паперу з нажніцамі. Расказваў, на вакзале яго хацелі арыштаваць: думалі, што арцельшчык, халтуршчык — а ён проста чакаў поезда і, сумуючы, выразваў з паперы ўзоры.

***— Здаецца, зусім не мужчынская справа...***

— Да таго ж даволі рэдкая. У вёсках некалі рабілі занавескі на вокны, на бажніцы. А цяпер гэта асобны кірунак народнага мастацтва. Потым Вячаслаў Дубінка стаў шмат пісаць вельмі цікавыя апавяданні, абразкі.



Работа Яўгена ПЯСЕЦКАГА, якая стала вокладкай альбома «Времени черты», дзе сабраны фатаграфіі міжнароднага конкурсу газеты «Правда».

Мой добры таварыш, саратнік, фотакарэспандэнт часопіса «Маладосць» Валянцін Ждановіч, які пакінуў пасля сябе шмат работ. Гэта ён разам з Караткевічам ладзіў вандроўкі па рэках. Шмат пісаў. Таксама я быў блізка знаёмы з Сяргеем Грахоўскім, з Міхасём Стральцовым, з Нінай Загорскай (цяпер манахіня Кіра).

У «Звяздзе» яшчэ быў цудоўны фотакарэспандэнт Мікалай Амельчанка, выпускнік Маскоўскага ўніверсітэта. Ён прыехаў да нас якраз тады, калі я стаў праяўляць сябе сярод ветэранаў як малады расток. Калега і сябар у многім мне дапамог: у разуменні журналісцкага майстэрства, прафесійных якасцяў — не гнацца за хайпам, што спакушала ў канцы 1980-х, пачатку 1990-х.




Старонка з паэтычнага зборніка Яўгена ПЯСЕЦКАГА «Кола дзён» з вершам і здымкам аўтара.

***— У вашай творчасці якая тэма стала найбольш плённай?***

— Тэма, якую грунтоўна прапрацоўваю, — гісторыя і мастацтва Беларусі, жыццё канфесій, у асноўным праваслаўя. За штодзённай работай унутры канфесіі — гісторыя. Адкрыйце кнігі — і пазнаёмцеся з беларускімі святымі. У мяне былі рэпартажы з Іерусаліма. Там, у Феадосіеўскім манастыры, некаторы час пасля смерці спачывала Ефрасіння Полацкая. Я зрабіў і апублікаваў здымкі пра гэты манастыр. Святыя нашай зямлі — гэта героі Беларусі таксама, як і, напрыклад, лётчык Уладзімір Карват, які адвёў свой самалёт ад падзення на вёску. Мая праца ў тэме праваслаўя Беларусі — даць магчымасць чытачу ўбачыць герояў сваёй краіны.

***— Цягам 29 гадоў вы ўдзельнік міжнароднай навукова-асветніцкай экспедыцыі «Дарога да святыняў».***

— Першы раз у гэтым годзе не паехаў — захварэў. Можа, якоганебудзь майго калегу паклікала б сфера інжынернай думкі, хтосьці пайшоў бы ўслед за астраномамі, біёлагамі... А я з 1993 года штогод удзельнічаў у экспедыцыях. Рэпартажы «Дарогі да святыняў» адлюстроўваюць: духоўнасць, гісторыю, лёс чалавека, прыроду. Для мяне гэта была найбагацейшая магчымасць напрацоўваць матэрыялы, адточваць майстэрства, назапашваць тэмы.

***— Ці дапамагала гэта рабіць прырода? Беларускі эколаг і рэжысёр Ігар Бышнёў, адзначаючы, што людзям трэба навучыцца жыць у гармоніі з наваколлем, сказаў: «Калі і ёсць Бог, то гэта прырода».***

— Бачыў шмат яго работ. З яго фотаздымкаў відаць, што гэта заўважана вачыма вельмі ўмелага, дасведчанага спецыяліста, які шмат ведае. Адштурхоўваючыся ад сітуацый у прыродзе, яе законаў, ствараеш. Існасць прыроды сцвярджалі ўсе філосафы свету і ва ўсе часы. Прырода для мяне — гэта акно ў веды. Тое, што бачу ў прыродзе, або пацвярджае, або абвяргае мой асабісты вопыт. Гэта вучыць, дае асацыяцыі для разважання. Прырода адкрывае тое, што секунду назад я не ведаў і не мог ведаць. Шмат гадоў я вёў у часопісе «Родная прырода» старонку «Рыфмы прыроды». Напрыклад, выпаў першы снег — шукаю выразны здымак і верш адпаведны пішу. Для мяне гэта была вельмі цікавая работа, аддушына сярод будзённых тэм.

***— У адным са сваіх нядаўніх восеньскіх рэпартажаў вы напісалі: «Гармонія фарбаў прыроды заўжды ў суладдзі з паэтычнымі радкамі». Пра гэта ваш уласны жанр сінтэзу верша і фота, якім вы аздобілі і свой паэтычны зборнік «Кола дзён»?***

— Гэта яўленне маіх эмоцый. Не для таго ж чалавек піша музыку, каб камусьці спадабалася. Кожны стварае тое, што выяўляе яго эмоцыі. Мне спадабалася меркаванне, што паэзія — гэта не літаратура, а выказванне эмоцыі, у прыватнасці калі я кажу пра суседства паэзіі з фатаграфіяй. Літаратурны жанр патрабуе найглыбейшай распрацоўкі тэмы, гісторыі, фактажу, а тут дзве страфы — і ніякага багажу фактаў. Галоўнае, што чапляе, — эмоцыі. Фатаграфія і вершы мне дапамагаюць гэта паказаць.

***— Фотамастацтва — баланс дакументальнасці і мастацкасці. Ці лёгка тут парушыць межы?***

— У дадзеным выпадку гаворка ідзе аб прыкладной частцы — рабоце ў прэсе. Тут дакументальнасць, відаць, — асноўнае. Ды дадаецца яшчэ адзін аспект — публіцыстычнасць. Мала прысутнасці дакументальнага — патрэбна мастацкасць, каб на яе рэзаніраваў глядач. І абавязкова ў рамках патрабаванняў публіцыстыкі.

***— Што гэта значыць?***

— Фотапубліцыстыка — той складнік фотамастацтва, які ператварае фатаграфію ў інструмент дыялогу. Менавіта дыялогу, а не маналогу. Чытач павінен адгукацца на фотаработу, фотарэпартаж, фотанарыс... За кожным фактам я бачу падтэкст, а паколькі захапляюся паэзіяй, стараюся заўважыць у фактах метафары, параўнанні, сугуччы, процiпастаўленні. Тое самае і ў здымках. Яны памiж сабой — як словы ў вершы: могуць рыфмавацца, супрацьстаяць, быць у алітэрацыі, паўтараць складовыя часткі. Могуць з'яўляцца і колеравыя сугуччы. У чым поспех фотарэпартажу, фотанарыса? Мала перадаць сутнасць падзеі, — некалькімі фатаграфіямі, якія паміж сабой звязаны, як кінематаграфічная стужка, неабходна да таго ж паказаць драматургію. Як і ў літаратуры і паэзіі. Проста інструмент іншы. Тое самае робяць і мастакі. Дастаткова зірнуць на трыпціх, напрыклад, Міхаіла Савіцкага. Мала таго што ён аб'ядналь колерам, тэмай, ён мае яшчэ агульную кампазіцыю, адна лінія праходзіць праз усе палотны.

Метафарычнасць, якая выкарыстоўваецца ў літаратурным творы, павінна прысутнічаць і на фотаздымку. Інакш звычайная будзе выява, зафіксаваная камерай назірання на дзвярах крамы. Альбом «Времени черты», на вокладцы якога — мая работа, сабраў фатаграфіі міжнароднага конкурсу газеты «Правда». Тут мой здымак «Наваполацк. Вялікая хімія. Графіка будоўлі», які атрымаў Гран-пры. Мне было 27 гадоў. Я доўгі час ездзіў з камандзіроўкамі ад газеты «Правда» па ўсім СССР. «Правда» выдавалася тыражом пяць мільёнаў экземпляраў. Калі бачыш там сваю інфармацыю, адчуваеш наймацнейшы адрэналін. Тваю публікацыю чытаюць мільёны. Гэта давала такі матывацыйны эфект, што я і мае калегі працавалі напоўніцу, з мокрымі спінамі.

***— Скажыце, славіць выйгрышнае фота — гэта ўдача або прафесіяналізм?***

— Удача часам напаткоўвае, канешне. Дзеля гэтага імкнуся быць заўсёды напагатове. Усе мы часам бачым удалыя моманты, але крыўдна, калі аказваемся не напагатове.

***— Паэту працэй: запомніў і адлюстраваў у вобразах.***

— І не проста ў вобразах — у эмоцыях. Адна справа — убачыць, а іншая — імгненна ўзважыць: а як гэта будзе выглядаць на здымку? Можа, неэстэтычна? Неабходна захаваць грань паміж дазволеным: ці можна чалавека сфатаграфаваць у гэтым выглядзе? Адна справа — ён скажа: не, я не хачу фатаграфавацца ў гэтым капелюшы, іншая справа — што скажуць людзі. І вельмі балюча будзе, калі людзі скажуць дрэнна. Самацэнзура — рэч вельмі стрымлівальная. Прымаеш рашэнне, зыходзячы з правіл маралі...

**Гутарыла Наталля СВЯТЛОВА,**
**фота аўтара.**

# ФРАНТАВІК АЛЕСЬ САВІЦКІ ПАКІНУЎ АЎТОГРАФ НА РЭЙХСТАГУ

**Споўнілася сто гадоў з дня нараджэння беларускага пісьменніка, партызана і франтавіка Алеся Ануфрыевіча САВІЦКАГА**

**Біяграфія гэтага ўнікальнага чалавека сама па сабе нібыта легенда: партызан — франтавік — журналіст — пісьменнік... Прыпісаў сабе год, каб трапіць у партызаны. На яго рахунку шмат падарваных эшалонаў, спаленых і ўзарваных мастоў. Тройчы паранены... Ордэн Славы III ступені знайшоў яго праз паўвека пасля заканчэння вайны. Які лёс!.. Не будзе перабольшаннем сцвярджаць, што яго жыццё — як сюжэт для захапляльнага серыяла.**

Мы часта стэлефаноўваліся, сустракаліся ў Доме прэсы і на факультэце журналістыкі БДУ, на прэзентацыях кніг у бібліятэках, разам наведвалі яго сяброў-партызан у Рэспубліканскім інтэрнаце ветэранаў вайны і працы ў Ждановічах. Абмяркоўвалі самыя розныя тэмы — літаратурныя, жыццёвыя, будзённыя. І ўсё ж найчасцей размаўлялі пра Другую сусветную вайну: аналізавалі, чаму некаторым так карціць перапісаць гісторыю. Гэты артыкул у многім пабудаваны на фрагментах шматлікіх гутарак з пісьменнікам.

## «Састарыў» сябе, каб стаць партызанам

Алесь Ануфрыевіч Савіцкі нарадзіўся ў Полацку. Юнацтва, па сутнасці, не было: у 1942 годзе стаў партызанам атрада «Смерць фашызму», пазней — камандзірам падрыўной групы атрада «Бальшавік» брыгады імя Варашылава. У 1944-1945 гадах у дзеючай арміі, удзельнічаў у вызваленні Варшавы і Гдыні, у баях за ўзяцце Берліна. Пасля дэмабілізацыі працаваў у рэдакцыі полацкай газеты «Бальшавіцкі сцяг». У 1958-м скончыў Літаратурны інстытут імя Горкага ў Маскве і аспірантуру. Аўтар кніг «Кедры глядзяць на мора», «Жанчыны», «Палын — зелле горкае», «Самы высокі паверх», «І нічога ўзамен», «Зямля не раскажа», «Літасці не чакай», «Памерці заўсёды паспееш», «Обаль», «Пісьмо ў Рай», многіх іншых.

Яго сапраўдны, «біялагічны» год нараджэння адрозніваецца ад «афіцыйнага», занатаванага ва ўсіх энцыклапедыях: 8 студзеня 1924 года. Прызнаваўся: *«Насамрэч я з 1925-га. Перад вайной скончыў 8 класаў. У партызанах прыпісаў сабе год, адтуль і пайшло... Я быў у падрыўной групе Няфёдава атрада «Смерць фашызму», якім кіраваў тады палкоўнік Жараў. Гэта яго партызанскі псеўданім. А сапраўднае прозвішча — Пётр Кісялёў».*

*«Зімою сорак другога мяне параніла. Разам з Сяргеем Зімніцкім мы мініравалі чыгунку ў сасновым бары паміж Полацкам і Фарынава. Міну — амаль дваццаць кілаграмаў толу, выплаўленага з артылерыйскіх снарадаў, — паставілі, але адбегчыся далёка не паспелі: цяжка было адольваць завалы з таўшчэзных сосен, аплеценых дротам і закіданых снегам. Выбуху не чуў; памятаю вялізнае, на ўсё неба, малінава-белае сонца і ціхі, вельмі ціхі і прыгожы гул, як бомканне маленькіх званоў... Выратаваў мяне Сяргей. Ён першы апрытомнеў, доўга поўзаў па снегавых гурбах, але мяне знайшоў і пацягнуў да лесу. Потым я апрытомнеў таксама і папоўз сам («Пад роднымі клёнамі»).*



У 1943 годзе 20 камсамольцаў атрада «Смерць фашызму» паслалі на арганізацыю новага камсамольска-моладзевага атрада «Бальшавік». Савіцкага прызначылі камандзірам падрыўной групы. І так да злучэння з арміяй.

## «Стагнала ад болю зямелька беларуская»

*«Я прайшоў «партызанку» з 1942 года і абсалютна перакананы, што такой яскравай старонкі ў жыцці беларускай зямлі не было — калі паўстаў увесь народ, ад мала да вяліка. Так, шмат разоў бяда засявала сваім чорным насеннем наш край, і стагнала ад болю зямелька беларуская. За стагоддзі, што сплылі ў нябыт, ваенная ліхалецця пранеслася над нашай Бацькаўшчынай нямала, але такога жаху яшчэ не было... На дзюралевай спражцы рэменя кожнага салдата вермахта быў надпіс: «З намі Бог». Сп'янелыя ад лёгкіх перамог над краінамі Еўропы, выдатна ўзброеныя нямецкія салдаты верылі ў гэта. Але Бог быў не з тымі, хто заліваў зямлю крывёю жанчын і дзяцей, хто рабаваў і паліў гарады і вёскі. Бог быў на баку тых, хто бараніў сваю Бацькаўшчыну. Такой мужнасці — мужнасці не асобнага чалавека, а ўсяго народа! — гісторыя Беларусі не ведала. І калі сёння той-сёй спрабуе абылгаць, аплюваць гераічную старонку зямлі і народа, — уся мая партызанская сутнасць устае супраць гэтага».*

## «Арыя абалваньвання»: прапісана ў дактрыне...

Ён неаднаразова гаварыў пра тое, што асабліва непакоіла: узгадваў пасляваенную дактрыну Алена Далеса, часта цытаваў яго прароцтвы. Алесь Ануфрыевіч быў перакананы: тое, што адбываецца з аплёўваннем гісторыі, і ёсць ажыццяўленне дактрыны Алена Далеса: *«Неяк на сустрэчы з мінскімі студэнтамі-першакурснікамі, будучымі настаўнікамі, я спытаў у даволі шматлікай аўдыторыі: ці ведае хто-небудзь імя і прозвішча ленінградскай школьніцы, Героя Савецкага Саюза, якая ўлетку 1941-га прыехала на Віцебшчыну да бабулі ў вёску ля станцыі Обаль, актыўна ўдзельнічала ў камсамольска-маладзёжным падполлі, гераічна загінула ад рук фашысцкіх катаў. На вялікі жаль, не адказаў ніхто. Сумнае і горкае гэта маўчанне. А яго не павінна быць».*

Будучым настаўнікам пісьменнік задаваў пытанне пра Зіну Партнову (1926—1944), члена падпольнай камсамольска-маладзёжнай арганізацыі «Юныя мсціўцы». Раман «Обаль» ён прысвяціў «Юным змагарам Прыдзвіння, якія загінулі ў барацьбе за волю сваёй Бацькаўшчыны». На думку Алеся Савіцкага, фэйкі пра гісторыю Беларусі, ветэраны, якія мужную старонку змагання з акупантам добра разлічаны, прычым у гэтым прасочваецца пэўная планамернасць і заканамернасць:

*«Фальсіфікуецца гісторыя вайны, апраўдваюцца-абяляюцца гітлераўскія прыхвасні. А што робіцца ў Эстоніі, Латвіі, ва Украіне... На жаль, і ў Беларусі не абыходзіцца без мярзотнасці. Адна так званая «незалежная» (відаць, ад праўды?) газета надрукавала матэрыял пад загалоўкам «Сыты партызан — галодны народ». Знайшлі чалавека, які расказвае: партызаны былі сытыя, бо забралі ў народа ўсё. Потым яшчэ ганебная публікацыя — пра ролю жанчыны ў партызанскім руху... Выхопліваць па-за кантэкстам асобныя «факцікі» і на іх падставе спрабуюць перапісаць гісторыю».*

## «Калі льюць бруд на жанчын, якія ваявалі, ува мне ўсё пратэстуе»

*«У нашым атрадзе было дзве медсястры — Каця Канцыял і Каця Несан. А што такое партызанскі санінструктар? Гэта палявы шпіталь, які месяцца ў звычайнай сумачцы, перакінутай праз плячо. Гэта ўжо потым, у 1943 годзе, калі ў ворага былі адваяваны велізарныя тэрыторыі, працавалі партызанскія шпіталі, кожную ноч садзіліся самалёты на партызанскія аэрадромы, вывозілі параненых на «вялікую зямлю»... Помню, Івану Лемешу ў баі прастрэлілі нагу разрыўной куляй, і ноччу якраз сеў самалёт. Хлопца вывезлі, уратавалі жыццё. Пасля вайны ён вярнуўся ў Полацк, працаваў у журналістыцы. Дажыў да 82 гадоў. Напрыканцы вайны меддапамога была больш-менш наладжана, а напачатку ўсё гэта клалася на плечы дзвюх маладзенькіх дзяўчат. Каця Несан загінула пры прарыве страшнай блакады летам 1944-га, непадалёк ад Ушач. Яна была паранена — і прасіла адно: пакінуць ёй пару гранат».*

***«І партызаны пакінулі ёй, параненую, з гранатамі?»*** — спытала пісьменніка.

*«Так. Брыгада ішла на прарыў, разумееце?.. Была страшная калатнеча, там загінула вельмі многа людзей. І аператар Марыя Сухава, якая здымала прарыў, таксама гераічна загінула. Калі льюць бруд на жанчын, якія ваявалі, — ува мне ўсё пратэстуе. Бо гэта з той жа «арыі абалваньвання». Як і хлусня пра партызан-забойцаў. Немцы стварылі лжэпартызанскія атрады — вы думаеце, гэта проста так было зроблена? У лжэпартызанскіх атрадах былі здраднікі, вышкаленыя галаварэзы, адпетыя бандзюгі, ворагі Беларусі — выдатна падрыхтаваныя, вымуштраваныя, вельмі добра ўзброеныя. І самае страшнае — што яны былі забяспечаны бездакорнымі дакументамі. У адной з вёсак, помню, расказвалі, што адбывалася напярэдадні: 12 чалавек у савецкай вайсковай форме рабавалі, гвалтавалі, што толькі не вытваралі. Гэта варожая спецгрупа пакінула крывавы след. Падобных лжэпартызанаў было нямала. І з імі цяжка было змагацца. Будзем прама гаварыць: рыхтавалі падобныя правакацыі не дурныя людзі. Іх мэта перш за ўсё прапагандысцкая: зняславіць партызанскую вайну... Гаварыць пра нейкае марадзёрства, напрыклад, у зоне нашай брыгады (Полаччына) проста смешна: там кожная вёска навідавоку, у кожным населеным пункце — падпольныя групы. А з якой нянавісцю ставіўся народ да немецкіх памагатых. Нашыўка паліцэйскага на рукаве — гэта прысуд».*

**Ад рэдакцыі**

*Наша калега Таццяна Падаляк, працуючы ў «Звяздзе», у свой час падрыхтавала нямала публікацый пра Вялікую Айчынную вайну. Шчымліва і пранізліва пра тыя падзеі ў яе матэрыялах расказвалі і простыя ветэраны, і франтавікі, якія сталі пасля вядомымі людзьмі, — Іван Шамякін, Міхаіл Савіцкі, Пімен Панчанка... Быў сярод герояў і пісьменнік Алесь Савіцкі, якому 8 студзеня споўнілася 100 гадоў.*

*Таццяна Падаляк, сёння доктар філалагічных навук, прафесар журфака БДУ, падрыхтавала да юбілею пісьменніка артыкул пра Алеся Ануфрыевіча для часопіса «Беларуская думка». Урыўкі з гэтага матэрыяла, у аснову якога пакладзены ў тым ліку і матэрыялы са «Звязды», мы і прапануем сёння вашай увазе.*

## Ордэн Славы «знайшоўся»... праз 55 гадоў

Калісьці спытала Алеся Ануфрыевіча: дзе больш складана было — у партызанах ці ў дзеючай арміі?

*«Пры ўсіх страхоццях ваеннага франтавога жыцця ўсё-такі там было лягчэй. Бо ты адчуваў, што за тваёй спінай — франтавы шпіталь, магутнасць арміі... Пасля злучэння з часцямі Савецкай Арміі мы, партызанская моладзь, папоўнілі 3-і механізаваны Сталінградскі танкавы корпус. Я трапіў у 9-ю гвардзейскую брыгаду дэсантнікаў. Дайшлі да Шаўляя, там увосень 1944-га была такая страшная калатнеча... Мяне параніла — трэці раз за вайну (да гэтага два разы ў партызанах). Пасля шпіталю ў Арэнбургу трапіў на фронт ужо пад зімовае наступленне: Варшава, Гдыня... Вайну скончыў у Берліне».*

***«Алесь Ануфрыевіч, Вы сапраўды пакінулі аўтограф на Рэйхстагу ці гэта метафара?»***

«Ну, якая метафара?! Сапраўды — распісаўся. У мяне ёсць медаль «За ўзяцце Берліна».

***«А партызанскія ўзнагароды?»***

«У 1942 годзе атрымаў ордэн Чырвонай Зоркі. Ужо пазней былі ордэны Айчыннай вайны І ступені, «Знак Пашаны», Францыска Скарыны... Самае цікавае, што доўгі час не ведаў аб узнагародзе за баі пад Шаўляем. Прайшло 55 гадоў. Аднойчы раздаецца тэлефонны званок: «Гэта з ваенкамата. Мы знайшлі наградныя дакументы — у 1944 годзе вы былі ўзнагароджаны ордэнам Славы». Думаю: хто ж гэта з нашых хлопцаў-пісьменнікаў мяне разыгрывае? Каб падтрымаць жарт, пытаюся: «І многа нас?». У адказ: «Не, з ордэнам вы адзін. Яшчэ адзін з медалём».

***«Вы на самай справе падумалі, што гэта розыгрыш?»***

«Абсалютна! Аказалася, прыйшоў новы ваенкам, даслалі запыт у архіў — і там знайшлі дакументы аб узнагароджанні. Атрымаў ордэн Славы праз 55 гадоў, у 1999-м... Але ўсё аддаў бы, каб паўсталі адтуль, з нябыту, з магіл, усе мае хлопцы: Фёдар Кулеш, Генадзь Прылоўскі, Коля Паўлаў... Можа, свет быў бы іншым, калі б жылі тыя мільёны, якія ляглі ў зямлю. Яны, можа, напісалі б лепшыя песні і лепшыя кнігі; можа, яны б зрабілі адкрыцці, якія здзівілі б свет...»

***«Мая куля дасталася сябру»***

Перш чым стаць пісьменнікам, Алесь Савіцкі быў журналістам. Пачаў друкавацца ў 1943 годзе, у ветрынскай падпольнай газеце «Чырвоная звязда». Па зразумелых прычынах заметкі падпісваў: Саша С., кам. падрыўгрупы.

Алесь Ануфрыевіч пакінуў мне на памяць ксеракопію нумара 5 (791) газеты за 7 лістапада 1943 года, дзе апублікавана яго заметка «Клятва падрыўнікоў». Вось цытата: *«Двое сутак група ляжала ля чыгункі, выглядаючы, дзе і калі праходзяць патрулі, дзе бываюць нямецкія засады (...) За кастрычнік намі ўзарвана 550 м тэлеграфнай сувязі, узарваны чыгуначны мост даўжынёю 9 м, спалена два шасейных масты, абстраляны тры эшалоны з жывой сілай, выведзена са строю два паравозы, падбіта маторная дразіна. За адзін месяц група мае на сваім рахунку 42 забітых немцы».*

А самы першы твор Алеся Савіцкага быў змешчаны ў партызанскай насценгазеце: *«Я напісаў верш на смерць майго сябра Колі Паўлава. Ён шкляр, як і я. Масквіч, пайшоў у народнае апалчэнне разам з бацькам. Сын быў кантужаны, бацька — паранены. Абодва трапілі ў палон. Бацька сканаў ад ран. Коля яго пахаваў і ўцёк з палону. Далучыўся да нашага атрада. Ён быў у маёй падрыўной групе. Аднойчы групу на заданне пад Загацце павёў не я, а Паўлаў. Бо выпаў першы снег, а ў мяне валёнкі былі не падбітыя, прамакалі... Усё сваё жыццё я жыву з думкай пра тое, што калі б я пайшоў пад Загацце ў той лістападаўскі вечар... Гэтая мая куля дасталася Паўлаву, маю смерць ён узяў на сябе... Пахавалі яго ў Бабынічах. Быў сонечны дзень, уся вёска высыпала на вуліцу. Камісар атрада Іван Іванавіч Стрыкель загадаў пахаваць Колю Паўлава на кветкавай клумбе каля бальніцы. Пасля вайны яго перанеслі на пагорак, там прыгожы манумент... Тады ж мы напісалі Колевай маці — чарнавік пісьма захоўваецца ў Нацыянальным архіве. А колькі іх, такіх маладзенькіх, загінула. Якая цана заплачана за сённяшняе жыццё...»*

Алесь Савіцкі пакінуў і копію насценгазеты «Боевой листок» № 5 ад 4 верасня 1943 года — гэта орган партыйна-камсамольскай групы 1-га ўзвода атрада «Бальшавік». Насценгазета ўтрымлівае чатыры заметкі. Тэкст, малюнкі — усё ад рукі...

І яшчэ цікавая дэталь. Калі наведвалі баявую сяброўку пісьменніка, былую партызанку, мінёра-падрыўніка Алену Нікадзімаўну Пігулеўскую ў Рэспубліканскім інтэрнаце ветэранаў вайны і працы ў Ждановічах, Алесь Ануфрыевіч пазнаёміўся з жанчынай, якую доўгі час ведаў як «завочна». Былая стэнаграфістка газеты «Звязда» Ніна Іванаўна Казармшчыкава працавала ў рэдакцыі з 1946 па 1980 гады. У канцы 40-х — пачатку 50-х не было ніякай тэхнікі, апаратыўная інфармацыя з рэгіёнаў перадавалася па тэлефоне стэнаграфістцы. Адным з актыўных пазаштатных аўтараў «Звязды» быў полацкі журналіст Алесь Савіцкі. Яны кантактавалі па тэлефоне, а пазнаёміліся асабіста толькі праз 60 гадоў...

Алесь Ануфрыевіч заўсёды ахвотна сустракаўся са школьнікамі, студэнтамі, вайскоўцамі. Тлумачыў: *«Пакуль мы, ветэраны, жывыя — мы павінны расказваць. Каб моладзь ведала: за яе жыццё заплачана кроўю мільёнаў. Новыя пакаленні, як бы яны ні жылі, усё роўна шчаслівыя людзі: у іх будуць дзеці, унукі, праўнукі, каханыя жанчыны — усё будзе. А ў тых, што ляглі ў 18-20 гадоў у зямлю, абараняючы яе, — у іх нічога не будзе. Ніколі... Пакуль я жывы, буду маліцца — я, стары атэіст заканелы! — буду прасіць Неба, каб ніколі новыя пакаленні не зведалі гэтага страхоцця, гэтай вайны, гэтай бяды».*

**Таццяна ПАДАЛЯК.**

НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

*Брастаўчанін Сяргей Белаяр, гісторык па адукацыі, піша ў жанры навуковай фантастыкі. Лаўрэат трэцяй ступені конкурсу апавяданняў «Звязды» 2018 года, пераможца абласной літаратурнай прэміі Брэсцкага аблвыканкама імя У. Калесніка 2019 года ў намінацыі «Проза» зноўку запрашае чытачоў у касмічнае падарожжа. На Месяцы два астранаўты расследуюць загадкавае знікненне сваіх таварышаў, чые сляды вядуць у дзіўны лаз, падобны на трусіную нару з вядомай казкі Льюіса Кэрала. Вось толькі не Белы Трус і Сакавіцкі Заяц сустрэнуцца Мэцьюсу і Уайтхэду ў гэтым змрочным месцы. Пакручасты сюжэт агаломшыць чытача і пакіне больш пытанняў, чым адказаў...*

**Алена Брава.**

# ЧАС НАЗАД

— Ну і за якім д'яблам яны сюды палезлі? — Мэцьюс спыніў месяцовы мабіль побач з такім жа ўсюдыходам місіі «Апалон-18», якая знікла без вестак.

— Пярун яго ведае, — пацісную плячыма Уайтхэд.

Два ланцужкі слядоў сыходзілі ад месяцовага мабіля да правалу ў рэгаліце, які нагадваў абваленую шахту. Дыяметр правалу не дацягваў і да пяці футаў, і заўважыць яго — правал зліваўся па колеры з астатнім пейзажам — можна было толькі выпадкова.

— Будзь напагатове, — загадаў Мэцьюс. У тым, што Гордан і Шміт сустрэлі на Месяцы іншапланецян, не верылі ні ў NASA, ані члены каманды «Апалона-19». Хутчэй, у кратэры Каперніка пабывалі рускія. Праўда, бянтэжыла поўная адсутнасць іншых слядоў. А прайшло ўсяго толькі менш за месяц.

Астранаўты падрыхтавалі да бою тытанавыя арбалеты спецыяльнай канструкцыі і з апаскаю зазірнулі ў правал. Якім жа было іх здзіўленне, калі сярод абломкаў астранаўты заўважылі лаз.

— Падобна на трусіную нару, — падзяліўся думкамі Уайтхэд, успамінаючы кэралаўскую Алісу.

— Белы Трус і Сакавіцкі Заяц на Месяцы?.. Да такога нават вялікі Жуль Верн не дадумаўся... Чаму яны нічога не паведамілі ні на Зямлю, ні на арбіту?

— Не ведаю.

Дапамагаючы адзін аднаму, астранаўты асцярожна спусціліся ў правал. Памеры лаза дазвалялі пралезці ў яго нават у груваcткіх скафандрах. Мэцьюс не мог праігнараваць відавочныя адбіткі ботаў Гордана і Шміта. Прэзідэнт Ніксан патрабаваў адказу — ніхто ў NASA не мог дакладна растлумачыць, што ж менавіта здарылася з «Апалонам-18».

— Я іду першым, — пастанавіў Мэцьюс.

Нават абсалютна псіхічна здаровы чалавек, трапіўшы ў лаз, лёгка мог перажыць прыступ клаўстрафобіі. Звілісты тунэль быў моцна падобны на кішку. Прыйшлося нават нагадаць сабе, што маналітныя сцены не сутыкнуцца і не раздушаць астранаўтаў. Не вернецца і гіпатэтычны «дзюнаўскі» чарвяк. Лаз нібыта прабіла вада.

Падарожжа расцягнулася на цэлую вечнасць, хоць Мэцьюс і Уайтхэд мелі магчымасць даведацца дакладна, колькі часу мінула. Абодва ўзрадаваліся, калі нарэшце выпалі з лаза. І адразу абмерлі — да стварэння невялікага памяшкання са згладжанымі кутамі прырода відавочна не прыклала нават мінімальнага намагання. «Пячору» дугой аточвалі рознапамерныя лазы.

— Выходзіць, мы не самотныя? — зрывістым ад хвалявання голасам спытаў Уайтхэд. Яго вочы загарэліся дзіцячым захапленнем.

Рэакцыя Мэцьюса аказалася іншай: праігнараваўшы пытанне аб братах па розуме, капітан перахапіў арбалет і пачаў выклікаць Томпсана, які чакаў вяртання таварышаў у камандным модулі на арбіце.

— Сувязі няма, — праз нейкі час канстатаваў Мэцьюс. Уайтхэд толькі кіўнуў — навушнікі гермашлема транслявалі выключна белы шум. Пытанне вяртання пілот месяцовага модуля не ўзняў.

На жаль, якія-небудзь знакі ці ўказальнікі, па якіх можна было б меркаваць аб тым, куды накіраваліся Гордан і Шміт, у рукатворнай пячоры адсутнічалі.

— Пойдзем па самым шырокім ходзе, — Мэцьюс звярнуўся да логікі. Для таго каб мець магчымасць без праблем вярнуцца да месяцовага мабіля, астранаўты карысталіся грыфельным мелам. Тактыка даказала сваю эфектыўнасць ужо на першых метрах — лаз разгаліноўваўся, становячыся падобным на каранёвую сістэму.

— Не хацелася б уступаць у кантакт з месяцовымі мурашкамі, — агучыў уласныя страхі Уайтхэд. Радыёсувязь з камандным модулем па-ранейшаму адсутнічала. Лабірынт станавіўся ўсё больш заблытаным. Большасць памяшканняў аказаліся запячатанымі. Частка пустых выкарыстоўвалася для захоўвання россыпу складана-геаметрычных прадметаў. Чорны глянцавы колерператвараў іх у сапраўдныя люстэркі.

— Паспрабуем адкрыць? — удакладніў Уайтхэд, літаральна згараючы ад цікаўнасці.

— Мы тут не за гэтым, — Мэцьюс прымусіў сябе трымаць навуковую цікавасць у аброце. Перадусім — пошукі Гордана і Шміта.

Блуканне па лабірынце магло працягвацца да поўнага расходавання запасу кіслароду, электраэнергіі і вады. На дапамогу астранаўтам прыйшоў выпадак.

— Я бачу Шміта, — паведаміў Мэцьюс і промнем ручнога ліхтара пазначыў мёртвага астранаўта. Пілот месяцовага модуля супакоіўся ў «пячоры», з нізкай столі якой крута ўверх сыходзілі вузкія трубкі, падобныя на паветразаборнікі.

Шміт ляжаў на жываце. У позе, якая выдавала гарачае жаданне збегчы.

— Пераварочваем, — распарадзіўся Мэцьюс.

Цела, за вылікам вагі скафандра, гермашлема і рыштунку, важыла на здзіўленне мала. Прычына высветлілася тут жа.

— Малпа, — ахнуў Уайтхэд і чамусьці адскочыў. Як быццам тая магла ўкусіць яго праз шкло.

— Homo ergaster, чалавек, які працуе, — паправіў Мэцьюс, ліхаманкава спрабуючы адшукаць рацыянальнае тлумачэнне таму, як архантрап мог апынуцца ўсярэдзіне скафандра з патчам «Schmitt». Прыматаў у місіі «Апалон-18» не выкарыстоўвалі. Людзі абыходзіліся танней.

— Як гэта разумець? — разгублены Уайтхэд утаропіўся на Мэцьюса ў надзеі на тое, што той усё растлумачыць.

— Шміт пакінуў сляды.

Шмітам валодаў жывёльны страх. І заставалася толькі здагадвацца, чым ён мог быць выкліканы. Арбалеты астранаўты трымалі напагатове.

Іншапланецяне?

Мэцьюс міжволі азірнуўся, сувраваджаючы насцярожаны погляд рухам арбалета. Схавацца ў «пячоры» было няма дзе. Хіба што іншапланецяне зусім ужо невялікага росту...

Перарывісты, падобны на трызненне шызафрэніка ход думак Мэцьюса абарвала пытанне Уайтхэда:

— Цікава, што гэта за штука такая?

У адрозненне ад людзей, скафандры не...

...састарэлі.

— Не чапай! — крыкнуў Мэцьюс, але было позна: часткі чужога механізму прыйшлі ў рух. У іх узаемадзеянні прысутнічала нейкая нечалавечая логіка. І гэтая логіка аказалася пабудавана на парушэнні звыклых фізічных законаў.

Нядоўга думаючы, Мэцьюс кінуўся да Уайтхэда і з сілай тузануў яго за руку, цягнучы да выхаду. Якім бы ні было прызначэнне чужога механізма, сабранага з дэталяў невядомай прыроды, ад яго трэба было трымацца далей. Як і ад самой пячоры.

Уайтхэд нечакана пакорліва рушыў услед за Мэцьюсам, аднак варта было астранаўтам сустрэцца вачыма, як сэрца Мэцьюса ўпала: з хуткасцю, якая імкліва нарастала, Уайтхэд скочваўся ўніз па эвалюцыйнай лесвіцы.

Інстынкт выжывання ўзяў верх. Мэцьюс адштурхнуў таварыша і з усіх ног кінуўся прэч. Усё роўна куды. Абы далей ад гэтага месца...

Наляцеўшы на цела Шміта, Мэцьюс расцягнуўся на падлозе, падняўшы воблака пылу. Дзіркі ў столі... магчыма, удасца выклікаць дапамогу. Пілота каманднага модуля. Ужо што тамака пайшло не так, невядома. Бранд загінуў пры прылуненні.

Томпсан дапаможа. Трэба толькі падаць сігнал SOS.

Мэцьюс нечакана ўсвядоміў, што сэнс звыклых рэчаў пачынае імкліва знікаць з яго свядомасці. Страх падсцёбнуў, і з дзікім лямантам Мэцьюс літаральна панёсся па выпадковым тунэлі. Астранаўтам валодала адно-адзінае жаданне — як найхутчэй прыбрацца з праклятага Месяца.

Пакуль не стала запозна.

Момант, калі шалёны крык пазбавіўся апошніх нотак чалавечага, Мэцьюс прапусціў. А пасля нават пры ўсім жаданні не здолеў бы зразумець, што адбылося. І з якой мэтай чужы механізм, які сціснуўся да памеру фалангі мезенца, узяў курс на Зямлю.

Тунэль са слядамі неадназначнага падзення, якія не паспеў прыцярушыць касмічны пыл, вывеў астранаўтаў у прасторнае памяшканне мудрагелістай формы. Вялікую яго частку займаў складаны механізм.

Мэцьюс згубіўся ў пошуках аналогіі, а праз некалькі імгненняў стала не да таго — на падлозе ляжаў парантрап у скафандры.

— Калі гэта Рычард Гордан, то я — Папа рымскі, — Уайтхэд правёў пальчаткай па шкле гермашлема. Неабходнасці сціраць пыл не было — у святле ручных ліхтароў перад поглядамі астранаўтаў паўстала морда Paranthropus boisei. Грубыя, нібы высечаныя сякерай рысы твару выдавалі жах. Скафандр і гермашлем засталіся цэлымі.

Мэцьюс спахмурнеў. Кошт розыгрышу быў залішне высокі. Празмерна высокі. Прасцей напампаваць каманду «Апалона-19» тым жа ЛСД. Саветы пад страхам вайны ніколі не рашацца па падмену. Ды і навошта?

**Сяргей БЕЛАЯР**

# ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ГОМЕЛЬСКАЙ ALMA MATER

**Нядаўна споўнілася 35 гадоў з часу надання Гомельскаму дзяржаўнаму ўніверсітэту імя Францыска Скарыны. Наш універсітэт нездарма носіць імя славутага вучонага, асветніка і першадрукара, чый партрэт знаходзіцца ў ганаровай Залі Сарака Падуанскага ўніверсітэта. Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт мае сталыя літаратурныя традыцыі. Тут вучылася шмат вядомых і адораных пісьменнікаў, журналістаў, вучоных. Пры кафедры беларускай літаратуры амаль дзесяць год працуе літаратурны музей «Alma mater», створаны па ініцыятыве загадчыка кафедры прафесара Івана ШТЭЙНЕРА.**

У музеі прадстаўлены матэрыялы, прысвечаныя выпускнікам ГДУ, якія праявілі сябе як у мастацкай творчасці, навуцы, так і ў журналістыцы.

Экспазіцыя музея пабудавана храналагічна. Гісторыя нашай літаратурнай alma mater бярэ пачатак з 1930-х гадоў, калі тады яшчэ ў педагагічным інстытуце імя В. Чкалава вучыліся Іван Шамякін, Леанід Гаўрылаў, Мікола Сурначоў, Кастусь Кірэенка, Паўлюк Пранузa. Яны атрымалі дыпломы ў першыя дні Вялікай Айчыннай вайны. Леанід Гаўрылаў, Мікола Сурначоў і Алесь Жаўрук загінулі, абараняючы Радзіму. У вершы 1941 года «У стоптаным жыце» Мікола Сурначоў прадказаў уласны лёс:

*Ніколі не ехаць*
*Хлапцу маладому*
*Да роднага гаю,*
*Да блізкага дому*
*Ляжыць ён, як віцязь,*
*У стоптаным жыце.*
*Маці спаткаеце —*
*Ёй не кажыце.*

Цяпер ніводная славянская анталогія ваеннай паэзіі ўжо не можа адбыцца без гэтай славутай балады Сурначова.

Пра Леаніда Гаўрылава загадчык кафедры беларускай літаратуры, прафесар Іван Штэйнер выказаўся наступным чынам: «Уваходзіны так і засталіся спадчынай. Але і па гэтых творах мы бачым, якога паэта ад нас забрала вайна. Жыццё, смерць і бяссмерце маладога воіна звязаны з подзвігам яго маці, якая ў невыносных умовах захавала на ўласных грудзях сшытачак з творамі сына і яго сціплы здымак, тым самым уратаваўшы яго голас ад векавога забыцця. Маці дала творам сына другое жыццё, дзякуючы яе мацярынскай любасці і веры мы сёння можам ізноў пачуць пранікнёныя вершы яе сына».

Унікальныя матэрыялы перадала музею сям'я паэта Паўлюка Пранузы — рукапісы, фотаздымкі, кнігі. Паўлюк Пранузa прайшоў вайну, распісаўся на Рэйхстагу, а пасля працаваў настаўнікам, журналістам. Хрэстаматыйным стаў верш паэта «Не экскурсантам, а салдатам»:

*Не экскурсантам, а салдатам,*
*Абпаленым агнём баёў,*
*З гранатамі ды аўтаматам*
*На дах рэйхстага я ўзышоў.*

*Глядзеў на ўсход*
*я ў задуменні,*
*Здалёку бачыў родны край:*
*Палеткі ў зелені вясенняй,*
*Свой Гомель,*
*па-над Сожам гай.*

Аўтограф гэтага верша зараз таксама знаходзіцца ў музеі alma mater.

Таксама музею перададзены аўтографы вершаў паэта ваенных гадоў, асобныя экзэмпляры газеты «Чырвоная змена» за 1944 і 1945 гады, дзе надрукаваны вершы і артыкулы Паўлюка Пранузы, аўтографы з праўкамі вершаў, сямейныя фотаздымкі, рэдакцыйныя фотаздымкі супрацоўнікаў газеты «Звязда» за 1960-я гады, «Настаўніцкай газеты,» здымкі з пісьменніцкіх з'ездаў, пачынаючы з 1959 года. Кранаюць сэрца паштоўкі, адрасаваныя жонцы і падпісаныя ў вершаванай форме. Паўлюк Пранузa прысвяціў шмат вершаў сябрам па Гомельскім педінстытуце Міколу Сурначову, Міхасю Даніленку, франтавым сябрам. Аўтографы гэтых вершаў перададзены сям'ёй паэта нашаму музею. Сябрам Паўлюка Пранузы ў студэнцкія гады быў Мікола Сурначоў. Яны жылі ў адным пакоі. Абодва паэты перапісваліся да самай гібелі Сурначова. Паўлюк Пранузa самаадданa захоўваў памяць пра сябра. Невыпадкова, што менавіта Пранузa ўклаў зборнік Сурначова «Акопны спеў» (1986), куды ўвайшлі вершы паэта, лісты да яго сяброў, успаміны аб ім. Рабочыя матэрыялы да гэтай кнігі таксама перададзены музею.

Цікавыя ўспаміны пра гады навучання ў Гомельскім педінстытуце пакінуў Іван Шамякін. Яны таксама занялі свае належнае месца ў экспазіцыі музея.

Гомельскі ўніверсітэт выхаваў трох лаўрэатаў Дзяржаўнай прэміі Беларусі: Івана Шамякіна, Кастуся Кірэенку і Міхася Башлакова. Іх творчасці прысвечана асобная экспазіцыя.

Паказальна, што да мастацкай творчасці ў нашай ВНУ звяртаюцца не толькі філолагі, але і «фізікі» з «матэматыкамі», не толькі студэнты, але і выкладчыкі, і не абавязкова філолагі. Да прыкладу, акадэмік Іван Харламаў, заснавальнік навуковай школы па педагогіцы.

Асобны раздзел экспазіцыі прысвечаны творчасці выпускнікоў апошніх гадоў Алеся Бараноўскага, Ганны Новік, Святланы Кацюргінай, Марыі Маліноўскай ды іншых.

Шмат цікавых і вядомых імёнаў прадстаўлена ў экспазіцыі музея, прысвечанай журналістам, што атрымалі дыплом у сценах нашай alma mater.

Асобны раздзел экспазіцыі прысвечаны работам выкладчыкаў універсітэта і навуковай дзейнасці кафедры беларускай літаратуры. Кафедрай праводзіцца значная работа па вывучэнні жыцця і творчасці нашых выпускнікоў і землякоў. У 1999 годзе пад рэдакцыяй Івана Штэйнера быў выдадзены зборнік крытычных артыкулаў «Душа прычаліцца крылом да неба...», дзе творчыя партрэты колішніх студэнтаў пададзены праз прызму бачання студэнтаў канца 1990-х гадоў. Напярэдадні 75-гадовага юбілею Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта ў 2003 годзе пад рэдакцыяй Івана Штэйнера і Ірынай Бароўскай падрыхтаваны зборнік «Універсітэт літаратурны. Універсітэт песенны». А да 80-годдзя Гомельскага ўніверсітэта быў выдадзены зборнік «Alma mater universitatis».

**Анжэла МЕЛЬНІКАВА,**
**доктар філалагічных навук,**
**прафесар УА «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны».**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ
ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Открытое акционерное общество**
**«Дорожно-строительный трест № 3»**

ПРОВОДИТ 24 **января** 2024 **года в** 11.00
ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН
ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

**1.** Наименование продавца – организатора аукциона, его место нахождения и контактные телефоны: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел. 8 0222 712424.

**2.** Сведения об имуществе и его местонахождении, начальная цена.

К отчуждению предлагается имущество,
расположенное по адресу:
**г. Могилёв, по проспекту Шмидта (район ТЭЦ-2):**

• капитального строения с инвентарным номером 700/С-72270, наименование – здание склада, общей площадью 314,1 кв. м с входящими составными частями и принадлежностями: одноэтажное блочное здание склада с мощением, забором;
• капитального строения с инвентарным номером 700/С-72164, наименование – битумохранилище № 1, общей площадью 446,6 кв. м с входящими составными частями и принадлежностями: одноэтажное крупнопанельное здание битумохранилища № 1 с насосной и эстакадой;
• капитального строения с инвентарным номером 700/С-72300, наименование – здание битумохранилище № 2, общей площадью 454,8 кв. м с входящими составными частями и принадлежностями: одноэтажное кирпичное здание битумохранилище № 2 с насосной;
• капитального строения с инвентарным номером 700/С-72268, наименование – битумохранилище № 3, общей площадью 372,9 кв. м с входящими составными частями и принадлежностями: одноэтажное крупнопанельное здание битумохранилище № 3 с насосной, эстакадой;
• капитального строения с инвентарным номером 700/С-72271, наименование – здание склада, общей площадью 63,0 кв. м с входящими составными частями и принадлежностями: одноэтажное железобетонное здание склада;
• капитального строения с инвентарным номером 700/С-72274, наименование – здание склада, общей площадью 63,0 кв. м с входящими составными частями и принадлежностями: одноэтажное железобетонное здание склада;
• капитального строения с инвентарным номером 700/С-72272, наименование – здание склада, общей площадью 63,0 кв. м с входящими составными частями и принадлежностями: одноэтажное железобетонное здание склада;
• капитального строения с инвентарным номером 700/С-108638, наименование – подъездной железнодорожный путь, протяженностью 131,0 м с входящими составными частями и принадлежностями: сооружение «Подъездной железнодорожный путь»;
• иного имущества:
• ёмкость 15 $м^3$ с инв. № 2573;
• ёмкость 4,5 $м^3$ с инв. № 2947;
• ёмкость 10 $м^3$ с инв. № 2948;
• ёмкость 60 $м^3$ с инв. № 2949;
• ёмкость 28 $м^3$ с инв. № 2978;
• ёмкость 60 $м^3$ (подземная) с инв. № 2980;
• ёмкость 60 $м^3$ с инв. № 612;
• цистерна железнодорожная с инв. № 909;
• цистерна железнодорожная с инв. № 910;
• подстанция КТП 859250вкт с инв. № 2878;
• система охранной сигнализации с инв. № 3202;
• таль электрическая канатная ТЭ200-52120 с инв. № 2644;
• вагон общежитие с инв. № 2408;
• сеть электроснабжения с инв. № 4045, протяженностью 165,3 м.

Имущество по частям не продаётся.

Общая начальная цена с учётом снижения на 30 % **152680,32** (сто пятьдесят две тысячи шестьсот восемьдесят рублей тридцать две копейки) бел. руб. с НДС.

**3.** Информация о земельном участке.

Имущество, предлагаемое к отчуждению расположено на земельных участках, находящихся в постоянном пользовании ОАО «ДСТ № 3» с кадастровыми номерами 740100000005004090, 740100000005004074, 740100000005005532.

**4.** Дата, время и место проведения аукциона: **24.01.2024 в 11.00** по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, конференц-зал.

**5.** Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: **г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33;** дата: **18.10.2023;** время: **17.00.**

При подаче заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, подписывает с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. На участие в аукционе к заявлению прилагается:

- документ, подтверждающий внесение задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка;
- копия (без нотариального засвидетельствования) устава (учредительного договора – для коммерческой организации, действующей только на основании учредительного договора), имеющего штамп, свидетельствующий о проведении государственной регистрации, – для юридических лиц Республики Беларусь;
- копия (без нотариального засвидетельствования) свидетельства о государственной регистрации – для индивидуальных предпринимателей Республики Беларусь;
- доверенность (в случае необходимости).

**6.** Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.

**7.** Участник аукциона за 3 дня до проведения аукциона должен перечислить организатору аукциона задаток в размере 10 % от первоначальной стоимости. Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: р/с BY54BPSB30121192410119330000 код BPSBBY2X в ОАО «Сбер Банк», УНП 700049607. Размер задатка 1002,00 бел. руб.

**8.** Информация о порядке и сроках возмещения затрат на организацию и проведение аукциона: в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола победитель аукциона (претендент на покупку) обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона.

**9.** Сроки подписания договора купли-продажи имущества. Договор купли-продажи имущества должен быть подписан победителем аукциона (претендентом на покупку) в редакции организатора аукциона после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона и предоставления организатору аукциона копий платежных документов, но не позднее 5 рабочих дней.

**10.** Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: Положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества, находящегося в собственности ОАО «ДСТ № 3» (утверждённое приказом генерального директора № 5 от 03.01.2022).

**11.** Извещение о проведении предыдущего аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 3» размещено в газете «Звязда» 30.09.2023, на сайте ОАО «ДСТ № 3».

# ВЯРНУЦЦА «Ў КАЛЯІНУ»

## Як адаптавацца пасля зімовых свят?

**Час вечарынак далёка запоўнач, лянівага ранішняга гультайства, багатых застолляў застаўся ў мінулым. Надышла пара вяртацца да паўсядзённага жыцця. І не ўсім гэта даецца лёгка. Як аднавіцца пасля свят?**

Пачнем з таго, што час выконваць шчодрыя і безаглядныя навагоднія абяцанні самім сабе (адмовіцца ад негатыўных думак / шкодных звычак / пачаць правільна харчавацца / пасябраваць са спортам / змяніць працу/заняцца самаадукацыяй, і іншае, і іншае...) пакуль не прыйшоў. «Вяртанне ў каляіну» — гэта заўжды стрэс, адзначаюць псіхолагі. Таму не варта дадаваць сабе стрэсу, пачынаючы дзень з прабежкі ў шэсць гадзін раніцы, адцісканняў і падцягванняў, калі раней мы гэтага не рабілі. «Подзвігі Геракла» пакідаем на перспектыву — няхай бліжэйшую, але тую, што пакуль не надышла. Для пачатку — збіраем сваё жыццё і саміх сябе ў адзінае цэлае.

### 3 пункту гледжання псіхалогіі: пра любоў да сваёй працы

Выраз «А каму зараз лёгка?» як ніколі дарэчны ў першы дзень першага па-сапраўднаму працоўнага тыдня студзеня (перазменку паміж Новым годам і праваслаўнымі Калядамі ў разлік, мабыць, браць не будзем). Вымаўляючы гэты выраз, вы маеце рацыю і... не маеце. Псіхолагі адзначаюць, што лягчэй за ўсё перажываюць вяртанне да звыклага працоўнага рытму людзі, якія добра матываваныя на працу. Гэта значыць, тыя, хто працуе на любімай працы, адчувае, што займаецца сваёй справай і праводзіць працоўныя гадзіны ў калектыве, што прыемны і падабаецца. У гэтым выпадку вяртанне да цікавых працоўных задач і любімых калег не ўспрымаецца як трагедыя: вы проста пачынаеце рабіць тое, што робіце штодня на працягу года, без стрэсу і напругі, і паступова ўцягваецеся. Стрэс, а таксама пытанне, як яго перажыць, узнікаюць пасля адпачынку / вялікіх свят / доўгіх выхадных у тых, хто на працы «цягне лямку», заняты нялюбай справай і «адбывае» працоўныя дзень як пакаранне, сцвярджаюць псіхолагі. У гэтым выпадку чалавеку сапраўды цяжка. Вам здаецца, што за час свят вы «на ўсё забыліся», даводзіцца аднаўляць у сваёй галаве «па кавалачках» працоўныя задачы і працэсы. Дык можа быць, варта прысвяціць першыя будні новага года — не, пакуль яшчэ не дзеянням, але прадумванню стратэгіі свайго жыцця. Зразумець, што б вы хацелі памяняць і чым сапраўды хочаце займацца. І што можна зрабіць у найбліжэйшай будучыні, каб пераўтварыць ідэі ў мэты і ўвасобіць іх у жыццё.

Але незалежна ад таго, любіце вы сваю працу або не, у працоўны рэжым важна ўваходзіць паступова. Не плануйце занадта вялікія нагрузкі, звышзадачы і аўрал прама на першыя дні пасля свят, па прынцыпе «ў вір галавой». З высокай доляй верагоднасці вы атрымаеце не рэзкае ўключэнне ў працоўны працэс, а стрэс і выгаранне. Няхай колькасць працоўных задач на першыя дні будзе пасільнай і нават ашчаднай. Вядома, гэта не значыць, што трэба адкладаць тое, што можна зрабіць сёння, на паслязаўтра: відавочна, што створаны вамі «снежны камяк» рана ці позна абрынецца лавінай на вашу галаву. Але ўменне аддзяляць тэрміновыя працоўныя задачы ад тых, якія «пакуль цярпяць» — асабліва важны навык у першыя пасляісвяточныя дні, і ён дапаможа вам уключыцца ў працу паэтапна, з паступовым нарошчваннем нагрузкі, як і раяць псіхолагі.

Аптымальным напачатку студзеня будзе, напрыклад, планаванне глабальных стратэгічных задач на распачаты год: гэта добрая «размінка» перад тым, як актыўна ўключыцца ў працу. Таксама нядрэнна ў пачатку года знайсці час, каб прааналізаваць свой звыклы будзённы графік: ці ёсць у ім месца (і час) для паляпшэння здароўя і самаадчування, наколькі разумна выбудавана асабістая лагістыка, як варта ўдасканаліць свой тайм-менеджмент. Менавіта мяжа паміж гадамі — той перыяд, калі пазітыўныя перамены даюцца лягчэй і больш трывала ўваходзяць у жыццё.



У цэлым, студзень (асабліва першая яго палова) — наогул ідэальны час для планавання ва ўсіх сферах жыцця. А таксама падыходзіць для любых пачынанняў. І пачаць можна хоць бы з адной добрай звычкі, якая будзе з гэтага часу адзначаць кожную вашу працоўную раніцу. Гэта можа быць, напрыклад, лёгкая ненапружаная зарадка, шклянка свежавыціснутага соку ў дадатак да сняданку ці звычка праходзіць пешшу хоць бы адзін прыпынак да працы: шмат часу такі мацыён не зойме, а бадзёрасць падорыць. Тут падыходзіць любая карысная — і менавіта ранішняя! — звычка. З гэтага часу яна будзе «запускаць» ваш дзень: арганізм у цэлым і мозг у прыватнасці будуць працаваць больш прадукцыйна. Такі вось псіхалагічны фокус.

Яшчэ адна слушная парада — «фільтраваць кантэнт» у першыя тыдні студзеня. Якімі б роднымі і блізкімі не здаваліся вам калегі, не варта пачынаць працоўны год з абмеркавання негатыўных навін (якіх у свеце заўсёды дастаткова), нараканняў на дрэннае надвор'е ці недахоп асабістых фінансаў пасля свят, выказванні незадаволенасці рашэннямі начальніка. Калі ўжо без гэтых тэм не абысціся, уключыце іх «у парадак дня» бліжэй да канца студзеня, калі рабочы рытм увойдзе «ў каляіну». І ўжо зусім супрацьпаказаны ў першыя рабочыя дні года тэмы накшталт «як усім нам неахвота зноў ісці на працу». Няхай нефармальныя зносіны будуць лёгкімі і пазітыўнымі. Пагаварыце аб падарунках, пахваліцеся поспехамі дзіцяці, раскажыце нязлы анекдот, пахваліце новую прычоску калегі — толькі тое, што паднімае настрой, і нічога больш.

І не варта драматызаваць: вяртанне да штодзённасці і ўключэнне ў паўсядзённы рытм жыцця пасля свят — нармальны жыццёвы працэс, які адбываўся з вамі не раз, і не раз яшчэ адбудзецца.

### 3 пункту гледжання дыеталогіі: пра любоў да самога сябе

Калі за навагоднім сталом вы дазволілі сабе лішняга, і ў выніку шалі паказваюць на некалькі кілаграмаў больш, чым вы чакалі — не дакарайце і не вінавацьце сябе. Святы на тое і святы, каб парадаваць смакавыя рэцэптары і перадаць станоўчыя эмоцыі ад смачнай ежы. А зараз прыйшоў час вярнуцца да звыклага рацыёну. Да звыклага (калі лічыць, што ваш рацыён у цэлым здаровы: да штодзённага фаст-фуду, зразумела, не варта вяртацца), а не да катавання сябе жорсткай дыетай. У гэтым апошнім выпадку арганізм «абалдзее» ад такіх «арэляў» — ад багацця да аскезы — і «нанясе зваротны ўдар», уключыўшы «рэжым самазахавання». Ваша дыета, калі вы не ўладальнік сапраўды жалезнай сілы волі, будзе асуджаная на зрыў, і ў выніку замест пахудання вы, хутчэй за ўсё, набярэце яшчэ пару-тройку кіло. Лепш паступова вярнуцца да звыклага рацыёну, размеркаваўшы прыёмы ежы раўнамерна на працягу дня і адначасова збалансаваўшы пітны рэжым: вада знізіць апетыт, падтрымае правільны абмен рэчываў, і вы адчуеце сябе лепш.

Калі падчас свят вы выходзілі на прабежку толькі па маршруце ад тэлевізара да халадзільніка — ізноў жа, не лайце сябе. І не вытрывайце на лыжную прабежку на наступны дзень пасля каляднага застолля. Такім чынам вы толькі адхіліце сябе ад фізічнай актыўнасці на ўвесь год. Лепш выйдзіце на шпацыр у парк або сквер, прайдзіце кіламетр ці два па ўпрыгожаным агнямі горадзе — нават такая ашчадная нагрузка дапаможа спаліць некаторую колькасць калорый. А «спартыўныя дасягненні» адкладзіце прынамсі да другой паловы студзеня.

Наладзьце рэжым сну: як ні дзіўна, гэтая рэкамендацыя таксама належыць да запуску працэсу пахудання. Падчас сну наш арганізм выпрацоўвае картызол — гармон, які нармалізуе абмен рэчываў. Да таго ж, калі мы спім, мы не ямо. Карацей, адны плюсы. Толькі класціся спаць для эфектыўнага пахудання важна да 23.00 — у гэтым выпадку «лішняе» будзе згараць хутчэй.

Але вернемся да паўсядзённага рацыёну. За час зімовых свят — самых хлебасольных у годзе — мы, як кажуць у народзе, «разбілі страўнік». Гэта значыць, прывучылі арганізм да вялікіх аб'ёмаў высокакаларыйнай ежы. Святы скончыліся, звычка засталася, і зараз вы ўвесь час хочаце есці? Выратуюць прадукты з нізкай каларыйнасцю: чым больш іх будзе ў вашым рацыёне, тым менш месца ў ім застанецца для высокакаларыйных страў. Напрыклад, на пераварванне ялавічыны наш арганізм затрачвае больш за 30% яе каларыйнасці. А вось мяккая свінінка не можа «пахваліцца» падобнымі суаднosінамі. Гароднiна (бульба не лічыцца!) і любое зяленіва таксама здольныя знізіць агульную каларыйнасць дзённага рацыёну. Пры гэтым тая ж капуста ці морква дапамогуць захаваць ужо звыклыя аб'ёмы порцыі, а каларыйнасць меню будзе на патрэбным для страты аб'ёмаў цела ўзроўні.

Ну, а праз тыдзень пасля апошняга святочнага застолля варта правесці разгрузачны дзень. Арганізму не пашкодзіць адпачынак ад шматдзённага абжорства. Да таго ж дзень «аскезы» дазволіць паставіць рашучую кропку ў харчовых празмернасцях. Асновай разгрузачнага дня могуць стаць, напрыклад, кісламалочныя прадукты нізкай тлустасці, вы можаце зрабіць сабе «бялковы» дзень (з варанай без солі курынай грудкай у якасці асновы рацыёну) або абраць асноўнай стравай рыс — прыродны абсарбент. Арганізм выведзе лішкі солі і вадкасці, і вы будзеце выглядаць прыгажэйшым і маладзейшым. Важны нюанс: гарбату і каву ў разгрузачны дзень не п'ем, абыходзімся карыснымі травянымі зборамі і мінеральнай вадой без газы.

Злоўжываць такой жорсткай дыетай не варта: разгрузачны дзень таму так і завецца, што ён — адзін, больш не трэба. Бо аснова здароўя і прыгажосці ў любым узросце — любоў да сябе, а катаванне сябе жорсткімі дыетамі — кароткі шлях да неўрозу і хвароб. Лепш замест самаабвінавачванняў у празмернасцях за навагоднім сталом пахваліце свой арганізм за стойкасць і паабяцайце сабе ў далейшым (прынамсі, да наступнага Новага года) не прымушаць яго паўтараць такія «подзвігі».

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

# ЗЁЛКАВЫЯ САКРЭТЫ

## Ад чаго дапамагаюць сушаныя лісічкі

**Гэтыя веды назапашваліся стагоддзямі. Людзі прыкмячалі асаблівасці раслін. Іх ужывалі ў ежу, імі лячыліся, упрыгожвалі жытло падчас святаў, выкарыстоўвалі ў абрадах. Уменне жыць у суладдзі з прыродай было і адным з сакрэтаў душэўнага дабрабыту. Таму расліны падаваліся ў вышыўцы, песнях, казках, паданнях... На жаль, з перацяканнем насельніцтва з вёсак у гарады парушаліся даўнейшыя сувязі, і, калі раней зёлкавыя сакрэты перадаваліся праз пакаленні, то сёння ўжо стаіць пытанне аб захаванні і папулярызацыі традыцыйных ведаў. Менавіта гэтай тэме быў прысвечаны круглы стол, які правялі вучоныя Інстытута генетыкі і цыталогіі і Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук. Ён праходзіў у межах маштабнага праекта «Нарошчванне патэнцыялу для захавання традыцыйных ведаў, звязаных з генетычнымі рэсурсамі, і прававога рэгулявання доступу да іх у Рэспубліцы Беларусь» (праект ЮНЕСКА па Праграме ўдзелу на 2022—2023 гады). На ім сабраліся носьбіты традыцыйных ведаў з розных рэгіёнаў Беларусі, прадстаўнікі ўстаноў культуры і Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, прафесійныя ўрачы.**



Сафія КАТОК на сустрэчу з'явілася не толькі з сушанымі зёлкамі.

### СЛОВА НОСЬБІТАМ

**Загадчыца Пластоўскага сельскага клуба Сафія КАТОК** на сустрэчу з'явілася не толькі з сушанымі зёлкамі, але і з настойкамі і варэннем, пра якія ведае бадай уся вёска на Любаншчыне. У клубе адкрыты пакой траў, а мясцовы калектыў пенсіянераў з задавальненнем збірае зёлкі. Жанчына расказала, што тут нарыхтоўваюць лісце маліны, суніц, парэчак, брусніц, карані калгану, дзівасілу, лапчаткі, піжмы, бярозавую амялу, кветкі ліпы, чабор, мацярдушку. У сезон прастуд запатрабаваныя варэнне з дзьмухаўца і хваёвых шышак ці пупышак. Настойкі тут робяцца не толькі з зёлкамі, але і з грыбамі. Так, ад многіх хвароб дапамагаюць настойкі з вясёлкай ці лісічкамі.

**Раіса ВАЛЬКОВА,** якая таксама прадстаўляла Любаншчыну, прывезла рэзнікі — традыцыйныя стравы з тварагу. Мясцовыя гаспадыні цеста, якое ліпне да рук, наразаюць нажом. Акрамя таго, ім наносяць на вырабы малюнак у выглядзе розных крыжыкаў, драпін, адсюль і назва «рэзнікі». Пры Кузьміцкім сельскім доме культуры створана аматарскае аб'яднанне «Кузьміцкія прысмакі». Карысным стравам з тварагу, які робіцца з самакішы (кіслага малака), тут надаецца асаблівая пашана. Стравы з яго бываюць з рознымі дадаткамі, напрыклад, з карыцай, ці з трыпутнікам — апошні варыянт карысны для страўніка. Падзялілася жанчына і сакрэтамі мясцовых гарбат. Раней, калі не было завазных «індыйскіх чаёў», вясковыя жанчыны падсмальвалі на вогнішчы акраец хлеба, кідалі яго ў чыгунок з кіпнем, і так атрымліваўся напой з пахам хлеба. А яшчэ можна зачарсцвелы падсмажаны хлеб кінуць у слоік з цёплай гатаванай вадой, завязаць марляй ці анучкай і пакінуць на два дні ў пячурцы, каб пайшлі бурбалкі. Пасля слоік трэба на некалькі дзён пераставіць у халоднае месца. Калі скарынкі апусцяцца на дно, атрымаецца квас, застанецца толькі працадзіць настой. Таксама квас маглі рабіць з сушанымі яблыкамі ці салодкімі ягадамі. У вялікіх сем'ях жанчыны, якія ўжо не хацелі мець дзяцей, рабілі гарбатку з галінак вішні. Вішнёвы пучок кідалі ў чыгунок з кіпнем і ставілі ў цёплую печ на ноч. Натуральна, цяжарным такі напой забараняўся.

А яшчэ жанчына расказала, што ў пасляваенныя гады вяскоўцы збіралі па вясне рудыя «пупышкі» хвашча, сушылі, малолі і дадавалі ў хлеб.

**Святлана ПАРАШЧАНКА, загадчыца клуба на Веткаўшчыне, кіраўнік калектыву «Стаўбунскія вячоркі», адна з захавальніц абрада «Пахаванне стралы»,** падзялілася сваімі сакрэтамі. З вясны ў вёсцы збіраюць падбел (сродак ад кашлю), пазней чабор, мацярдушку. Растуць у іх такія траўкі, як дуброўка (калган) і зуброўка. Пры болях у суставах у вёсцы прыкладаюць да хворага месца лісты капусты, дзядоўніка. Калі баліць пазваночнік, можна на ноч прыкласці ліст хрэна.

### ПАПУЛЯРЫЗАЦЫЯ

Пра сакрэты раслін сёння можна даведацца і ва ўстановах культуры. Напрыклад, мерапрыемствы, прысвечаныя зялярству, праходзяць у Беларускім дзяржаўным музеі архітэктуры і побыту. **Яго навуковы супрацоўнік Алеся ЗІНКЕВІЧ** выступае адным з іх арганізатараў. Дзяўчына падзялілася, што шмат якіх сакрэтаў пераняла ад свайго дзядулі, які жыў у Лагойскім раёне і збіраў розныя зёлкі. Так, у сям'і быў культ святаянніку — ім лячылі ўсе хваробы, ад галаўнога болю да праблем са страўнікам. З чорнай таполі збіралі пупышкі. Настойка з іх — тапялёўка — выкарыстоўвалася для лячэння драпін, парэзаў. Калі балелі ногі, іх расціралі настойкай з мухамора ці ўціралі лісце бэзу (у некаторых мясцовасцях лічыцца, што падыходзіць толькі белы бэз). Узвар з сасновых пупышак лілі на гарачыя камяні ў лазні, а мачалкі рабілі з дзеразы.

Шмат для захавання і папулярызацыі традыцыйных ведаў робіць супрацоўнікі музея народнай культуры Мазыршчыны «Палеская веда». Нямала цікавых звестак яны запісалі ў экспедыцыях. Так у адной з вёсак ім распавялі, што пры купанні нованароджанага хлопчыка ў ваду трэба класці чыстацел і ружовую півоню, каб ён вырас прыгожым, грошы — каб багатым. Купалі абавязкова на белай пялюшцы — каб твар быў чысты, без сыпу. Дзяўчынцы ў ваду клалі чыстацел, мядзвежыя вушкі, пялёсткі ружы — каб была прыгожай і добрай гаспадыняй. Ваду пасля купання вылівалі за парог, каб, як вырасце, пайшла з бацькоўскай хаты. Да года ў калыску клалі кавалак хлеба, каб дарослае жыццё ў нашчадка было сытым. Сродкам ад бяссоння былі шышкі хмелю, імі набівалі падушкі. Ад ціску выкарыстоўвалі каліну. Пры болях у суставах — настоі з мухамораў, сушаныя лісічкі давалі жаваць дзецям ад паразітаў.

Музей Элізы Ажэшкі ў вёсцы Мількаўшчына створаны на базе былой школы на малой радзіме пісьменніцы. Не дзіва, што ў ім вялікая ўвага надаецца зёлкам. Такім было хобі знакамітай зямлячкі. Улетку Эліза Ажэшка ехала з Гародні да прынёманскіх вёсак і разам з мясцовымі жанчынамі збірала расліны... У музеі частуюць вітамінными напоямі, расказваюць пра ўласцівасці раслін, робяць кампазіцыі з засушаных кветак.

Па сакрэты раслін можна завітаць і ў аграсядзібы. Напрыклад, пры сядзібе «Дайнаўскі двор» працуе майстэрня смаку «Зёлка-пчолка», гаспадары якой — частыя ўдзельнікі разнастайных фэстаў і фестываляў. Ідэю яны пазычылі з мінулага, калі дазналіся, што раней былі так званыя «пані аптэчковыя». Жанчын наймалі спецыяльна, каб яны нарыхтоўвалі зёлкі, займаліся вырабам мазяў, настоек, воцату. Такая пані — **Юлія ЛІТВІНАВА — і кіруе дайнаўскай майстэрняй «Зёлка-пчолка».** Яна робіць гарбаткі, у якія дадае як мясцовыя зёлкі, так і нешта сваё — эксперыментуе, падбірае расліны, каб атрымаўся пэўны водар. Юлія, як і раней яе бабуля, таксама пячэ караваі для маладых. Упрыгожвае іх жывымі кветкамі...

Маладыя гаспадары запісваюць за бабулямі рэцэпты і мясцовыя назвы раслін, распытваюць пра традыцыі, развучваюць народныя песні. У адной з экспедыцый, напрыклад, іх уразіў рэцэпт з мухамораў ад адной траўніцы. Настойку з іх тая закопвала ў зямлю ў «гнілыя дні» (калі дні стаяць пахмурныя, уначы на небе не відаць месяца). У зямлі настой павінен быў прастаяць 40 дзён.

### ФІТАПРАВІЛЫ

Сёння зёлкі становяцца папулярнымі, багата парад па іх выкарыстанні можна знайсці ў інтэрнэце, але як папярэдзіў **прафесар народнай медыцыны, фітатэрапеўт Мікалай АГРЭНІЧ,** з раслінамі трэба быць вельмі асцярожнымі. Многія з іх сапраўды здольныя дапамагаць у лячэнні пэўных хвароб, у той жа час яны могуць утрымліваць рэчывы, якія разбураюць печань і ныркі. Як, напрыклад, той жа разраклэмаваны ў сеціве акопнік. Перш чым заняцца такім лячэннем, трэба вывучыць, як працякае хвароба, якія іншыя захворванні могуць быць у чалавека. Часта фіталячэнне трэба падбіраць індывідуальна, асабліва, калі чалавек мае захворванні нырак. Аматарскае захапленне зёлкамі можа не прыбраць хваробы, а наадварот, ускладніць іх.

Калі трыпутнік ці палын даць хвораму на язвенную хваробу дванаццаціперснай кішкі, гэта пагоршыць яго стан. Ёсць шмат нюансаў, якія тычацца жаночага здароўя. Пры прыёме зёлак важна ўлічваць узрост і нават фазы цыкла пацыентак.

Трэба ведаць, як збіраць расліны, як іх ужываць. Ёсць сярод іх дубільныя, і тыя, што ўтрымліваюць слізь, яны ніяк не сябруюць у адным зборы. Верхняя, сярэдняя і ніжняя частка той жа крапівы могуць па-рознаму дзейнічаць.

Да таго ж чалавек недасведчаны можа лёгка заблытацца. Адну і тую ж назву людзі могуць даваць розным раслінам. Бываюць і розныя віды адной і той жа расліні, адрозніць якія паміж сабой і спецыялісту няпроста...



Раіса ВАЛЬКОВА, прывезла рэзнікі — традыцыйныя стравы з тварагу.

### ЯК ЗАХАВАЦЬ І НЕ НАШКОДЗІЦЬ?

Беларусь — адна з краін, якая падпісала Нагойскі пратакол, які тычыцца захавання генетычных рэсурсаў і традыцыйных ведаў, з імі звязаных. Сёння неабходна вызначыць, якім чынам можна абараніць «прыродны» пласт нематэрыяльных каштоўнасцяў, які быў назапашаны нашымі продкамі. Безумоўна, неабходна выхоўваць у грамадстве паважлівае стаўленне да такіх ведаў ды іх носьбітаў. Але існуе шмат пытанняў, на якія яшчэ трэба знайсці адказы. Важна захаваць назапашаныя веды, патрэбна папулярызацыя, але ці павінна бабулька, якая валодае тымі ж зёлкавымі сакрэтамі ці рэцэптамі мясцовых страў, дзяліцца імі з усімі, хто да яе прыязджае? Здаралася, што госці з «пазычаных» рэцэптаў атрымлівалі камерцыйную выгаду, калі друкавалі іх. Магчыма, традыцыйныя веды трэба вызначаць як аб'ект інтэлектуальнай уласнасці, а носьбітаў адзначаць дзяржаўнымі сертыфікатамі.

Хто мае права маральнае, інтэлектуальнае пераняць сакрэты зёлак? Ці мусіць за гэта плаціць? Як, прымаючы права на грашовую ўзнагароду, не змяніць менталітэт? Усё ж раней людзі не шукалі ва ўсім карысці, лічылі: госць у дом, гэта Бог у дом. Якія правілы трэба замацоўваць нарматыўнымі дакументамі і як даносіць іх да турыстаў, спажыўцоў, гасцей, можа, праз буклеты і памяткі?

Неабходна разумець, што часта веды, якія перадаваліся з пакалення ў пакаленне, мелі і сакральны складнік. **Загадчык аддзела арганізацыйна-метадычнай работы Любанскага раённага цэнтра культуры Сяргей ВЫСКВАРКА** прызнаўся, што калі ён бачыў, як у вёску Пагост прыязджалі на абрад Юр'е недасведчаныя людзі і з фотаапаратамі лезлі пасярод карагода, зрываючы сакральнае дзейства, «проста хацелася іх гнаць адсюль палкай». Да гэтага часу не сціхаюць спрэчкі вакол традыцыі выпякання хлеба. Раней гаспадыні нават дзяцей выганялі з хаты, калі мясілі цеста, а сёння паглядзець на гэты працэс ідуць незнаёмыя людзі. Кампраміс быў знойдзены ў тым, што дзейства было перанесена ў клубныя ўстановы.

Добрым варыянтам для папулярызацыі ведаў і стварэння на аснове іх раённых турыстычных брэндаў маглі б стаць аграсядзібы, але сёння неабходна гаспадарам даць правы на тое, каб яны маглі запрасіць людзей і правесці абрад ці тыя ж майстар-класы, звязаныя з зёлкамі.

Добрыя вынікі ў захаванні традыцыйных ведаў дае супрацоўніцтва са школамі. Тут прывіваецца любоў як да мясцовых звычаяў, абрадаў, фальклору, так і наогул да народнай культуры.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

# «ЯК МУДРАСЦІ СІМВАЛ НЯТЛЕННЫ»

## Вобраз Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра ў беларускіх літаратурных творах

**Год, які толькі што наступіў, пройдзе пад знакам падрыхтоўкі да вялікага свята — 900-годдзя Полацкага Спаса-Еўфрасіннеўскага жаночага праваслаўнага манастыра. Сакральнае месца беларусаў, авеянае легендамі... У 1125-м годзе манастыр заснавала святая прападобная Еўфрасіння Полацкая, адзіная дачка полацкага князя Барыса Усяславіча. Па сёння захаваўся Спаса-Праабражэнскі сабор, пабудаваны па яе замове дойлідам Іаанам. Сюды святая Еўфрасіння ахвяравала легендарны напрастольны крыж, зроблены майстрам Лазарам Богшам...**

**Гэтае месца натхняла творцаў розных часоў... Давайце калядны́мі днямі згадаем, як вобраз святой абіцелі занатаваўся на старонках мастацкіх твораў.**



### «ЦІ НЕ ТЫ, ПАННА, ПА МЯНЕ ПАСЫЛАЕШ, КАБ Я ЎЗЯЎСЯ ЗА ПРАЦУ?»

Найперш згадаем «Аповесць жыцця і смерці святой і блажэннай і найпадобнейшай Еўфрасінні, ігумені манастыра Святога Спаса і найсвяцейшай ягонай маці, што ў горадзе Полацку», якая была напісана ў XII стагоддзі. Хто аўтар гэтага жыція — застаецца гадаць, можа, Міхаіл, слуга Еўфрасінні, ці манах Давід, які суправаджаў прападобную ў паломніцтва ў Іерусалім, а мо яе сястра і спадзвіжніца Еўпраксія... Жыцце святой Еўфрасінні дайшло да нашага часу ў шасці рэдакцыях і больш чым 180 спісах XVI—XVIII стагоддзяў. Вось што гаворыцца там, як да Еўфрасінні, якая жыла ў келлі Сафійскага сабору, прыйшла думка пра заснаванне манастыра:

*«І ў адну ноч легла яна адпачыць пасля доўгіх стаянняў на малітве да Бога, і ўбачыла праяву: узяў яе анёл і павёў туды, дзе была царкаўка Святога Спаса, манастырская маёмасць Святой Сафіі, што людзі завуць Сяльцом. І паказаў яе ангел Госпадавы, кажучы так: «Еўфрасіння! Тут належыць быць табе!» Яна ж, абудзіўшыся, вельмі здзівілася, кажучы: «Што гэта значыць?» І ў тую ж ноч бачыла гэтае тройчы.»*

Выконваючы Божую волю, Еўфрасіння адправілася ў Сялец, прадмесце Полацка, каб заснаваць манастыр. Пачала будаваць і новы храм:

*«І тут хачу вам, братове, расказаць пра дзіва. Быў муж Іаан, прыстаўнік над майстрамі царкоўнымі. І колькі разоў на досвітку чуў голас ён, які прамаўляў: «О Іаане! Узрушся, ідзі на будоўлю царквы Усядзяржыцеля Спаса!» І аднойчы ён узняўся і прыйшоў да шчаснае Еўфрасінні і сказаў ёй: «Ці не ты, панна, па мяне пасылаеш, каб я ўзяўся за працу?» А яна адказвае: «Не». Але, падумаўшы, кажа яму шчасная тая жанчына: «Нават калі і не я цябе ўзрушваю, усё адно паслухай шчыра і ўважліва таго, хто цябе кліча на гэтую працу».*

Так майстар Іаан стаў дойлідам новага храма... Але дзівосы не скончыліся. Калі ўжо збудавана была царква, крыху не хапіла плітаў. *«І шукалі, але не знайшлі нічога».* І зажурылася Еўфрасіння, і пачала маліцца... *«А назаўтра па Божай волі знайшліся пліты ў печы, і ў той самы дзень скончана была царква і ўзнесены крыж».*

### «ПА РУІНАХ РАЗБУРАНЫХ КЕЛЛЯЎ...»

У 1926-м годзе, калі ішла апантаная барацьба з рэлігіяй, малады паэт Алесь Звонак пісаў пра Полацк:

*«Яснае сонца ўзышло над табою,*
*Звон багамольны змаўкае навек,*
*Свежаю, новай ідзе барознаю*
*Вольных палёў гаспадар-чалавек».*

Але ўжо ў наступным, 1927-м годзе, пасля наведвання старажытнага храма, збудаванага Еўфрасінняй, у паэта з'яўляюцца іншыя радкі. Нават нягледзячы на тое разбурэнне, што малады Звонак пабачыў, святое месца не магло не ўразіць:

*«Па руінах разбураных келляў,*
*Там, дзе зеўраюць з трэшчын вякі,*
*Я спускаўся ў твае падзямеллі,*
*І спалохана ў пальцах трымцелі*
*Свечак доўгія языкі...*

*Пачарнелыя глыбы скляпенняў,*
*Лабірынты бясконцых хадоў*
*Праглыналі дрыготкія цені...*
*Быў, як мудрасці сімвал*
*нятленны, —*
*Сцёрты надпіс далёкіх гадоў».*



### НЕЧАЛАВЕЧА ВЯЛІКІЯ ЗАДУМЛІВЫЯ ВОЧЫ ПРОДКАЎ

Не мог не згадаць Полацк і Уладзімір Караткевіч у сваім эсэ «Зямля пад белымі крыламі». Сярод іншых цікавостак старажытнага горада апісвае ён і Спаса-Еўфрасіннеўскі манастыр. Асабліва ўразілі пісьменніка фрэскі:

*«А непадалёк спаруда XII стагоддзя — славуты сабор Спас-Еўфрасінні з прыгожымі старажытнымі фрэскамі.*

*Калі сонца праз невялікія вокны трапляе ўнутр сабора, гэтыя фрэскі загараюцца бляклай чырванню і ржавым золатам. Нібы праз залаціста-карычневую, празрыстую ваду лясных рэк глядзяць на вас нечалавеча вялікія задумлівыя вочы вашых продкаў».*

### «ПАСЛЯ ДОЎГАГА ЗМАГАННЯ СА СПАКУСАМІ»

Для паэткі і пісьменніцы Валянціны Коўтун вобраз святой Еўфрасінні быў вельмі дарагі і блізкі, пра жыццё полацкай князёўны яна напісала раман «Пакліканыя». Шмат цяжкасцяў і выпрабаванняўustrакае героіня рамана ды яе аднадумцы. Нават той момант, калі Еўфрасінні з'явілася нябеснае пасланне, суправаджаецца пагрозлівымі дзэкарацыямі:

*«З нізкага неба нечакана дыхнула навальнічная задуха. Неба было чорнае, як дзёгаць. І хоць не ўпала яшчэ ні кроплі дажджу, над галавою прагрымелі ўдары грому, а ўвесь нябесны паддон раскроіла раздвоеная, бы змяіны язык, маланка...*

*...Праз колькі часу, адгарнуўшы новую абалонку свайго летапісу, ігумення Еўфрасіння запісала, што быў закладзены Спаса-Праабражэнскі манастыр у Сяльцы ноччу пасля доўгага змагання са спакусамі, з прывезенымі ёю Евангелле і трыма даравальнымі хлябамі ў імя Айца і Сына і Святога Духа напрыканцы месяца зарэння ў лета ад нараджэння Божага адна тысяча сто дваццаць шостае».*

### ЖАЛЕЗНЫ РЫЦАР СУТАРЭННЯЎ

Земляком святой Еўфрасінні быў і наш сучаснік Пятро Васючэнка. У эсэ «Полацкая антычнасць» ён успамінаў: *«Мы, полацкія мальцы, гэтак жа свята, як у табліцу множання, верылі ў існаванне падземнай галерэі паміж Спаса—Еўфрасіннеўскім манастыром і Сафійскім саборам. Мы былі ўпэўненыя, што адзін з уваходаў схаваны ў руінах цёплай царквы, пад заваламі з бітай цэглы, шкла і друзу. Калі б нам і ўдалося тады разабраць гэты лом і ўвайсці ў лабірынт, там пільнаваў бы злавесны жалезны рыцар. Пачуўшы нашы крокі па галерэі, ён выйшаў бы з цемры і сталёвым мячом назаўжды закрыў бы дарогу да дзённага святла, ракі, пескароў, футбольнага поля.*

*Другі ўваход размяшчаўся ў сутарэннях Крыжаўзвіжанскай царквы, тады змрочнай, апаленай маланкай, якую кінуў у яе святы Ілля, нібыта ў храме прытаіліся нячысцікі. Але за свірнавым замком, які навесіў на дзверы вартаўнік Трафімчык, жылі вушастыя стварэнні з чуйнымі вусікамі і такімі ж, як і ў іх уладара, чырвонымі вочкамі. Трусы — імя ім было легіён. Яны насіліся па сутарэннях галодныя, як шакалы, з драпежным піскам. Вартаўнік сек для іх маладыя дрэўцы і кідаў у вушастую зграю, і праз хвіліну ад стваліў, галінак, лістоты заставалася пацяруха. Тое ж самае магло здарыцца і з намі, патрап мы ў галодную зграю. Так правалілася адно з грандыёзных адкрыццяў мінулага стагоддзя».*

Нават у самыя неспрыяльныя для рэлігіі часы Спаса-Еўфрасіннеўскі манастыр і ягоныя вернікі былі сімвалам духоўнасці.

*«Вечарамі па вуліцы з ваяўнічай назвай Фрунзэ рухалася працэсія, якая нясла цішыню і мір. Багамольцы, пераважна жанчыны старэчага ўзросту, ішлі на вячэрнюю службу ў храм Еўфрасінні Полацкай. Мая абыякавасць змянялася трывогай і пытаннямі. Якая праўда, невядомая мне, даступная ім? Сёння, калі я іду за парадай, падтрымкай, дапамогай да прападобнай Еўфрасінні, мне ўспамінаюцца часы, калі на тэрыторыі манастыра панавала, як выказаўся адзін бацюшка, «мярзота запусцення». Стаяў абвуглены ўдарам маланкі Крыжаўзвіжанскі храм. Манахінь перавезлі ў Жыровічы, пад Слонім. Цёплая царква ляжала ў руінах. Не перапаўнялі вуліцу майго дзяцінства, якая зараз названа ў гонар святой, экскурсійныя аўтобусы. Але дух полацкай цывілізацыі, дрымотнай, не спаў».*

### «ЦЭРКАЎКІ БЕЛЫ ПАЖАР»

Яшчэ адзін славуты палачанін Навум Гальпяровіч, ствараючы вобраз роднага горада, пачынае з храма, пабудаванага святой Еўфрасінняй:

*«Вei замружу, і ўбачыцца вечар —*
*Белая цэркаўка тоненькай свечкай.*
*Гнёзды шпачыныя над Палатой.*
*Цені дубоў над халоднай вадой.*
*А за стагоддзямі ў прыцемку сінім*
*Вочы зямлячкі маёй, Еўфрасінні.*
*Цьмяна бялее на кнізе рука,*
*Б'ецца аб шыбу агонь матылька.*
*Полацк драўляны, малінавы звон...*
*Хто ты? Ці мроя, ці ява, ці сон?*
*Можа, твой майстар на холад мурой*
*Выплеснуць здолеў гарачую крой,*
*Позірк праменны, дыханне надзей,*
*Каб засталося святло для людзей?*
*Што ты хацела на роднай зямлі?*
*Ды цішыня. І стагоддзі прайшлі.*
*Толькі вось цэркаўкі белы пажар.*
*Толькі аблокаў павольных цяжар».*

У гэтым годзе нас чакае шмат імпрэзаў, прысвечаных Свята-Еўфрасіннеўскаму манастыру... Калі будзе магчымасць — абавязкова наведайце гэтае святое месца, каб ясней уявіць старонкі твораў беларускіх пісьменнікаў і паэтаў.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

## ОАО «ГОМЕЛЬОБЛРЕКЛАМА» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» (продавец) в лице ликвидатора ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» – директора ООО «Модель антикризисного управления» Будкова К. В. извещает о проведении 22 января 2024 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 30 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, каб. 2.9

**ПОЛНЫЙ ПЕРЕЧЕНЬ ИМУЩЕСТВА в количестве 17 лотов (№№ лотов 1–6, 8–18) размещен на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**
**Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 14.11.2023 г. № 220 (300950)**

**Продавец:** открытое акционерное общество «Жлобинский механический завод «Днепр», 247210, г. Жлобин, Гомельская область, ул. Школьная, 8.

Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел. **8 (029) 303-53-09, Григорович Павел Карлович.**

**Шаг аукционных торгов** – 5 (пять)% от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001 в дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, БИК BLBBBY2X, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту №__ **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно с **09 января 2024 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. 2.9 в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 18 января 2024 г. в 16.00 включительно.**

